

# „Пагоня“ ў сэрцы тваім і маім

# «Пагоня» ў сэрцы — тваім і маім

Складальнік
і навуковы рэдактар
Анатоль Цітоў

Мінск
Беларускае выдавецкае таварыства
«Хата»
1995

ББК 94.3
П 71
УДК 082

Навукова-публіцыстычнае выданне "Пагоня" ў сэрцы — тваім і маім". Складальнік і навуковы рэдактар Анатоль Цітоў. Зборнік. — МН.: Беларускае выдавецкае Таварыства "Хата", 1995, ...стар.
ISBN 985—6007—22—4

Многія граматныя і напаўграматныя людзі, з доктарскімі ступенямі і без ступеняў зачастую летазлічэнне, зачатак нацыі пачынаюць... з уласнага роду. Спрачацца з такімі невукамі, беларускага заводу ці прыблуднага роду — што сеяць на камэнне. Асабліва цяжка даказвацца перад няведкамі і няўмекамі па праблемах сельскай гаспадаркі, мастацтва, нацыянальнай сімволікі. Тут кожны — знаўца, кожны — вышэйшы суддзя.

Артыкулы кнігі — не асуджэнне памылковых чужых думкаў пра чуждае ім. Артыкулы — абарона беларускага, абарона доказная, неаспрэчная. Яны — для разумнага беларуса, і яго разумных суседзяў: рускага, паляка, украінца, літоўца.

У кнізе сабрана толькі частка матэрыялаў (1987—1991) пра сімволіку. У іх боль, перажыванні, доказы навукоўцаў розных нацыянальнасцяў пра славянскую сімволіку.

Для масавага чытача. Асабліва будзе карысная тым, хто яшчэ не мае цвёрдае пазіцыі ў дачыненні да беларускай святыні — герба "Пагоня".

П $\frac{3250140000}{}$ 22—95

ББК 94.3

ISBN 985—6007—22—4

© БВТ "Хата", 1995
© Афармленне А. Ї. Цыркуноў, 1995
© Складанне А. К. Цітоў, 1995
© Слайд і карта А. К. Цітоў, 1993, 1995

# Сімвал і мова — брат і сястра

Прафесар хіміі любіць беларускую мову, беларускія сімвалы. Беларус па паходжанню, выхаванню і, галоўнае, адчуванню, ён усюды сцвярджае: як народжаны Богам чалавек мае права дыхаць, так кожная нацыя мае права на існаванне. Кветкавая гама луга шмат пацерпіць, калі навекі знішчыць хоць адзін цвет.

Адзін мінус мае мілы прафесар. Ён скажа кілаграм слоў там, дзе патрэбны адзін грам справы. Не патрэбны — ні вам ні нам — яго высокія словы пра вартасць і значнасць беларускае мовы, сімволікі. Патрэбна драбніца: чытай лекцыі на роднай мове.

Ён можа чытаць, а не чытае. Ніхто яму не забараняе, не пярэчыць. Наадварот — хваляць ініцыятараў перабудоўнай беларусізацыі. Прафесар хіміі лекцыі на роднай мове не чытае — з-за элементарнай ляноты. Высокакваліфікаванаму спецыялісту патрэбна меней часу, чым прыезджаму рускаму прафесару, для пераходу на беларускую мову — два месяцы, не болей. Але іх патрэбна выдзяліць. Спекулянт-прафесар гэтага часу не выдзяляе. Тэарэтычна ён пашкадуе родны народ, пагароцішца пра яго занядбаную мову і сімвалы, а сам асабіста зрабіць шаг-другі для яе распаўсюджвання не можа.

Не можа гэта зрабіць і другі гаварун, ягоны сусед па кватэры. Настаўнік першым сказаў слова асуджэння супраць тых, хто ганьбіць слова народа, яго тысячагадовыя сімвалы. Як нармальны чалавек не можа хадзіць па вуліцы голым, так любое войска не можа быць без знакаў адрознення. Калі пра Полацкае княства ўзгадваюць летапісцы з 862 году, то яно ўжо мела ўсю неабходную для княства атрыбутыку. Мову і сімвалы дзяржаўнасці таксама.

Тым не меней усявед-настаўнік сваёй цагліны ў агульны

падмурак не кладзе. Не размаўляе па-беларуску, не скажа добрае слова пра сімвал "Пагоня". Настаўнік супраць пераходу школы на беларускую мову. Сваё дзіцё возіць у той дзіцячы садзік, дзе няма беларускага слова.

Прафесар і настаўнік рэзка не прымаюць пустапарожнае хамства зямляка, нядаўняга ваеннага. Адстаўнік ваюе супраць усяго беларускага. Выхаваны на лёгкадумным жыцці, газетных артыкулах шавіністычнага накірунку, былы капітан за "ничего менять не нужно. Нам и так хорошо".

Суседзі, усе трое, разлічваюць на розум таго, каго ўнутрана не цэняць, каго часта зневажаюць — на розум рабочага і селяніна. Тры трапачы не разумеюць, што хто не можа захаваць малога, не захавае і вялікага, бо любое вялікае пачынаецца з малога. Не стане ў народа сімвалаў самабытнай дзяржаўнасці і мовы — не стане народа.

За апошнія пацьдзесят гадоў з Поўначы і Засібірскіх прастораў знікла амаль дваццаць моваў. Хто ведае цяпер гэтыя народы? Таксама напаўінтэлігенты аргументоўвалі, што ўсё "устроится".

Устроілася?

Гэта ж хочуць зрабіць і на Беларусі. Рукамі саміх беларусаў.

Разлічваць на памяркоўнасць ці абыякавасць рабочага і селяніна да сімвалаў дзяржаўнасці і мовы зараз не прыходзіцца. Інстынкт самазахавання у нацыі, упэўнены, зпрацуе. Пры адной умове. Нейтральным стаўленні да любых рэферэндумаў сродкаў інфармацыі.

У нас жа, на Беларусі, як паказваюць даследванні і практыка, асноўная маса газетаў, праграмаў радыё і тэлебачання ў руках абыякаўцаў да беларускай мовы і сімвалаў. Менавіта таму прыезжды рускі шавініст, прафесар, былы партработнік, бесперапынку дае "адлупы" бязграматным беларусам. Фармуе наступальную русіфікатарскую палітыку.

Ён і калегі, як і беларускія абыякаўцы, часта цытуюць Маркса. Забываюць чамусьці ўзгадаць марксавую сакраментальную фразу, датычную іменна падобных абставінаў: "численность только тогда решает дело, когда масса охвачена организацией и ею руководит знание". Пра якое веданне вытокаў зараджэння беларускае сімволікі можна казаць, калі многія ваяры за славяншчыну на беларускіх землях (паваявалі б яны пра гэта ў Маскве і Варшаве, Сафіі і Браціславе) не бяруць большы адрэзак часу, чым 55 гадоў.

Украінцы, рускія пад сваімі цяперашнімі сцягамі і гербамі ходзяць шмат сотняў гадоў. За і супраць. Іх не папракаюць мазепаўшчынаю, гетманшчынаю, ула-

саўшчынаю. А на гарэтнай Беларусі, як свет клінам сышоўся. Дзяржаўцы даўмеліся: каб уесці палітычных апанентаў, гатовы аб'яўляць рэферэндум... пра мову, сімвалы.

А чаму б не аб'явіць рэферэндум, колькі мець чалавеку рук, як вымаўляць слова?

Дык паслухаем жа тых, да каго часта апелююць дэпутаты і недэпутаты.

...Двухмоўе — смяротны прысуд беларускай мове.

...Мова — наш апошні шанец духоўна адрадзіцца.

...Двухмоўе ў Канстытуцыі — гэта магіла беларускай мове.

...Галасаваць за двухмоўе у Канстытуцыі — ставіць крыж на беларускай мове.

...Рэферэндум па праблемах мовы — амаральна. Такога не ведала сусветная практыка. Не схіляйце беларусаў да самазнішчэння.

...Няма мовы — няма народа. Надакучыў лямант неадукаваных і нявыхаваных дэпутатаў, якія кепска ведаюць і рускую і беларускую мову.

...Нельзя выносить на референдум вопрос о родном языке. Это позорно! Прошу как избиратель голосовать по данному вопросу поименно, чтобы история знала, кто хоронит будущее Беларуси.

...Божа Усемагутны, пабудзі ў беларусаў пачуццё годнасці. ...Яны не ўмеюць пастаяць за сябе. Вось ужо сапраўды, як у анекдоце: "Дазволь, дзядзечка, мне ў сваёй хаце пад лаўкай пераначаваць".

...Паважаныя кіраўнікі Беларусі, я не бачыў Вашых асабістых выступленняў аб нацыянальным адраджэнні, патрыятызме, гордасці, што ты беларус ці грамадзянін Беларусі.

...У апошні час у рускамоўным друку на Беларусі нарастае актыўная прапаганда супраць Закона аб мовах. ...Нельга забіраць у беларуса самае дарагое — мову продкаў.

...З абурэннем чую выступы "народных" дэпутатаў супраць беларускай мовы, сцяга і герба. У расейскіх халуёў шавіністаў і ў іх халуёў з беларусаў, якія выступаюць ад імя беларускага народа, праразаецца зноў звярыны аскал.

...Якая ж гэта будзе незалежная Рэспубліка Беларусь, калі яна будзе мець дзве дзяржаўныя мовы? Раўназначна таму, што ў аднаго дзіцяці дзве "родныя" маці.

...Кожны народ хваліць Госпада на сваёй мове.

...Наданне рускай мове статуса дзяржаўнасці ў суверэннай Беларусі ганебна для нас, беларусаў. Гэта здзек як з гістарычнай спадчыны Беларусі, так і з яе нашчадкаў.

...Ніякага двухмоўя нельга ўводзіць.

...Народ мае свядомасць. Не мае яе асноўная большасць наменклатуршчыкаў. Пагарджаць мовай — пагарджаць людзьмі, якія сеюць і збіраюць для нас збожжа-хлеб. Пагарджаць мовай — праяўляць невуцтва і ляноту да мовы, у слоўніку якой больш двух мільёнаў слоў.

...Если кто поднимает вопрос о другом государственном языке, сразу возникает вопрос, чьи интересы он отстаивает: Москвы или Варшавы?

...Кожнай нацыі Бог даў сваю мову... Двухмоўе — самазабойства.

...Хто ж уваходзіць у гэтую ветэранскую арганізацыю? У асноўным людзі прыезджыя, не беларусы, большасць з якіх займалі добрыя пасады, прыклалі свае рукі да знішчэння нашай мовы, а цяпер хацелі б задушыць яе канчаткова.

Закончым цытаванне з кніжкі “Голас народа — голас Божы” (Мінск, “Навука і тэхніка”, 1993) фразаю яе укладальніка Ніла Гілевіча: “Якіх толькі тэарэтычных і палітычных і эканамічных падкладак не мосцяць яны (асобныя ляныя беларусы і людзі іншых нацыянальнасцяў, для якіх Беларусь не мачаха, а добрая маці. — В. С.) пад сваё негатыўнае стаўленне да ідэі адраджэння Беларусі, да працэсу беларусізацыі ...Што здарылася ў 30-ыя, калі спроба беларускага нацыянальнага адраджэння была бязлітасна задушана, цяпер не паўторыцца”.

Не паўторыцца? Калі дзяржава не будзе змагацца за сябе, калі народ не ўсвядоміць, што сімвал і мова — брат і сястра, што грэх тапіць самога сябе, — працэс можа паўтарыцца. У зменёным выглядзе, пад фарысейскія шкадобныя рэплікі, але можа паўтарыцца.

І тады трое ўзгаданых у пачатку артыкула суседзяў пашкадуюць беларуса. Паспачуваюць. Але грэх з сябе і ўласнага роду не знімуць. Цяпер трэба шкадаваць сябе, а значыць народ свой, зямлю сваю. Шкадаваць — значыць рабіць для яго, а не ўздыхаць.

Звярнём увагу чытача на наступнае. З-за спешнасці, абмежаванасці ў сродках гэтае выданне выходзіць без ілюстрацыйнага матэрыялу. БВТ “Хата” яшчэ раз выказвае падзяку вучоным, аўтарам артыкулаў — за адмову ад ганарару.

**Валер САНЬКО,**
**дырэктар БВТ “Хата”.**

# Лёс сімвала — лёс народа

Імкненне да самапазнання і самавыяўлення характэрна як для кожнага народу, так і кожнай асобе ў прыватнасці.

Неспрыяльныя ўмовы гістарычнага працэсу, што склаліся на нашае зямельцы ў апошнія двесці гадоў і асабліва за часы панавання бальшавізму, прывялі да значных стратаў нацыянальнай культуры і свядомасці. Адыёзныя прафесары камуністычных навукаў, якія сумленна адпрацоўвалі свае трыццаць срэбранікаў, рабілі ўсё магчымае для знівеліравання нацыянальнае самасвядомасці беларусаў. На жаль, у сваёй працы, яны дасягнулі пэўных поспехаў. Забароненыя і апляваныя святыні замянілі штучнымі сурагатамі, якія "варыліся" крамлёўскімі кухарамі і іхнімі памагатымі з мясцовых калабарантаў і манкуртаў. Але выціснутыя з афіцыйнага і паўсядзённага існавання і народнай свядомасці большасці людзей, яны засталіся ў гістарычных дакументах, старажытных кнігах, на пячатках. Захаваліся яны ў патаемных кутках сэрца народу. Як толькі шавінстычны, бальшавіцкі ўціск пачаў слабнуць, сімвалы нашых продкаў пачалі набываць усё большую моц і значэнне ў грамадскім жыцці Беларусі.

Але аджыўшыя ідэі і канцэпцыі не адыходзяць у нябыт самі па сабе — грамадскае пакаянне апосталаў таталітарызму не адбылося. Крыху ачуняўшы ад спалоху, яны зараз разгарнулі чырвоныя "флагі" і рушылі ў бой, за страчаныя прывілеі, за ўладу якая ўплывае з іхніх рук.

Сёння гэтая лінія фронту праходзіць праз сімволіку. Якой ёй быць — нацыянальнай, народнай ці адпавядаць узорам былой камуністычнай? Адказ на гэтае пытанне дае гэтая кніга. Як мы будзем ставіцца да нашае гістарычнае спадчыны так мы будзем ставіцца і да Баць-

каўшчыны. Ці мы будзем жыць у краіне Беларусь, ці зноў наш адрас стане "не дом и не улица", а Савецкі Саюз!

Мэтай зборніку з'яўляецца імкненне даць чытачу поўнае і яснае ўяўленне аб нашай вышэйшай нацыянальнае і духоўнае каштоўнасці — дзяржаўным сімвале — гербе ПАГОНЯ.

У кнігу ўключаны артыкулы як беларускіх, так і замежных аўтараў, якія дазволяць чытачу ўбачыць і зразумець сапраўдныя прычыны ўзнікнення і шляхі развіцця герба з выявай "Рыцера збройнага на коні". У яе ўключаны таксама матэрыялы, якія адлюстроўваюць думку шырокага кола прадстаўнікоў культурнага грамадства Беларусі аб нашым спрадвечным сімвале.

У зборнік ў асноўным ўвайшлі матэрыялы перыядычнага друку і асобных выданняў за 1987—1991 гг., калі разгарнулася вострая палеміка ў друку, а актуальнасць яго ўзрастае сёння ў сувязі з узмацненнем спроб навязаць беларусам чужынскі сімвал, а затым і ідыялогію.

Дасціпны чытач можа заўважыць у некаторых выпадках паўторы пэўных думкаў у розных артыкулах, але няхай гэта не будзе падставай для звінавачання аўтараў у кампіляцыі: жанр газетнае публікацыі не прадугледжвае навуковых спасылкаў.

Артыкулы размешчаны па храналагічнаму прынцыпу, імёны і прозвішчы аўтараў паказаны ў пачатку, а месца і час першага апублікавання, а таксама варыянты, у канцы артыкула.

Асобнае мейсца займаюць артыкулы, пісаныя па-за межамі Беларусі. Іхнія аўтары не ставілі сабе за мэту, асвятленне працэсаў развіцця нашае сімволікі і пытанняў сцягавай калярыстыкі. Але аб'ектыўнае, незаангажаванае стаўленне да гістарычных фактаў, вельмі яскрава і адназначна пацвярджае і ў пэўнай ступені дапаўняе правільнасць пазіцыі беларускіх навукоўцаў.

Мяркуем, чытачу будзе цікава азнаёміцца з інфармацыяй, што прыведзена ў артыкуле рыжскіх аўтараў П.Цюрына і М.Цюрына, што прысвечаны чырвона-белай сімволіцы Латвіі. Яны недзвухсэнсоўна адносяць гэтую калярыстычную гаму на карысць славянскага менталітэту і яго фарбава-густавых сімпатыяў.

Вельмі цікавым з'яўляецца артыкул аднаго са старэйшых маскоўскіх даследчыкаў, выдатнага навукоўцы ў галіне спецыяльных гістарычных дысцыплінаў Е.Камянцавай. (Адзначым, што менавіта на яе падручніку па геральдыцы і сфрагістыцы* выхоўваліся не адно пакаленне савецкіх гісторыкаў увогуле і архівістаў у прыватнасці.)

---

* *Геральдыка, навука аб гербах; сфрагістыка — аб пячатках. — А.Ц.*

Яе глыбокае даследаванне, прысвечанае маскоўскаму гербу "яздзец" параканаўча даказвае чыста славянскае (рускае — так у старажытнасці зваліся УСЕ славяне) паходжанне гэтага сюжэту. У артыкуле прасочаны розныя этапы фармавання гербу, дзе побач з традыцыйным "маскоўскім капейшчыкам", фігуруе на пячатках выява герба тыпу Пагоня (напр. Аляксандра Неўскага ці Дзімітрыя Данскога).

Ад сябе зазначым, што на пячатках полацкіх і "літоўскіх" князёў таксама ўжываўся сюжэт з выявай, падобнай на "маскоўскі" герб. Гэта ёсць адлюстраваннем своеасаблівага "перацёку" і ўзаемаабмену геральдычнай і іконаграфічнай інфармацыяй, што ў сваю чаргу пераканаўча сведчыць аб амаль тысячагадовай культурнай і духоўнай сувязі паміж славянскімі народамі. А гэта не эканамічныя стасункі, якія сёння разбурылі, а заўтра ўнавілі, разбурэнне мастка культурных сувязей, вядзе да адчуджэння. Эканамічныя інтарэсы можна задаволіць, гандлюючы і з папуасамі Новае Гвінеі, пігмеямі Афрыкі і індзейцамі Амазонскае сельвы, але духоўную і культурную агульнасць можна адчуць толькі ў кантакце з братэрскім народам.

Гарачыя галовы, якія верашчаць аб неабходнасці абрання новага герба для беларусаў і Беларусі такімі дзеяннямі разбураюць агульнаславянскую спадчыну. Ставячы пад сумненне беларускасць герба Пагоня, яны ўскосна ставяць пад удар і правы рускага народа на герб Яздзец (які быў дзяржаўным да XVI ст., калі быў прыняты дзвюхгаловы арол, а герб Яздзец быў тады пакладзены на яго грудзі).

Апаненты Пагоні, якія жадаюць пераўтварыць нашую зямлю ў поле для чужынцаў, а нас ва ўгнаенне для іншых нацыяў імкнуцца абдурыць народ, крадучы нашу спадчыну, падсоўваюць нейкі замаскіраваны бальшавіцкі сурагат. Яны сцвярджаюць, што герб Пагоня далі нам фашысты. Хлусня! Гэты герб быў выпакутаваны нашым народам на працягу ўсёй яго гісторыі. Заканадаўча ён быў аформлены не ў гады акупацыі, а ў 1566 г.

Тыя ж "заступнікі" беларускага народа сцвярджаюць быццам бы герб Пагоня не наш, а "літоўскі". Што гэта? Свядомае шахрайства ці поўнае няведанне гісторыі? У старажытнасці Беларусь мела назоў Вялікае княства Літоўскае (толькі яе ўсходнія часткі называліся Белай Руссю), а сучасная Літва тады называлася Жмуддзю.

Толькі дзякуючы антыбеларускай бальшавіцкай стратэгіі, калі была задушана Беларуская народная Рэспубліка, гэтая назва — Літва — была прынята Жмуддзю і на гістарычную арэну выйшла новая дзяржава.

Літва (а дакладней Летува) размешчаная на тэрыторыі

Жмуддзі, якая прысвоіла сабе старажытны славянскі герб Пагоня. Таму з'яўляецца поўнасцю няправільным довад асобных палітыкаў, быццам бы "мы маем герб падобны да герба суседняй краіны" (Летувы. — А.Ц.). Наадварот, гэта суседняя краіна мае герб падобны на наш.

Вялікі рускі паэт А.С.Пушкін у "Барысе Гадунове" пісаў:

*Литва и Русь, вы, братские знамена*
*Поднявшие на общего врага,*
*На моего коварного злодея,*
*Сыны славян, я скоро поведу*
*В желанный бой дружины ваши грозны...*

Як бачым, ён называе сынамі славянаў разам з Русью і Літву. Літвой увесь час лічылася заходняя частка сучаснай Беларусі (няхай чатач згадае Брэст Літоўскі, Камянец Літоўскі і, нават Мінск Літоўскі!)

У другім творы паэт згадвае аб "извечном споре с единоверною Литвой". "Єдіноверная" — г.зн. адной з Расіяй веры. Як вядома там дамінуючым з'яўляецца праваслаўе. У сучаснай Летуве да праваслаўя належыць так званае "рускамоўнае" насельніцтва — большасць якога беларусы. Яны апынуліся тамака калі ў 1939 г. І.Сталін падараваў "сэрца Заходняе Беларусі" — Вільню, а разам з ёй і Віленшчыну суседняй краіне, каб менш чым праз год заглынуць яе ўсю разам...

Але мы адхіліліся ад тэмы. Трэба ўсім аматарам "рэферэндумаў" уразумець, што гісторыя, культура, не падлягаюць галасаванням. Шлях народа, ягоныя здабыткі належаць людзям, якія адвеку жывуць і працуюць на сваёй зямлі. Аніводзін нармальны чалавек не будзе шляхам галасавання вырашаць якія яго бацька ці маці, увогуле ці гэта яны. Гісторыю нельга перайначыць. Нельга абдурваць увесь час і ўсіх. Хлусаў, у рэшце рэшт, чакае ганьба, забыццё.

Шкада толькі іхніх дзетак і ўнукаў, якім будзе сорамна, што іхнія крэўныя заплямілі сябе ўдзелам у бруднае справе.

У свой час бацька псіхааналізу Зыхмунд Фрэйд пісаў: "заканахаму эфіёпу не дакажаш прыгажосць еўрапейскіх жанчын". Але ў глыбіні душы мы маем (праўда, вельмі кволую) надзею, што дзядуля Фрэйд хоць трохі ды памыліўся, чаму і робім гэтую спробу і спадзяёмся, што будзем пачуты.

**Ст.навуковы супрацоўнік Беларускага навукова-даследчага цэнтру дакументазнаўства, археаграфіі і архіўнае справы**
**Анатоль ЦІТОЎ.**

*Тамаш ГРЫБ*

# Да пытання аб паходжанні гербу "Пагоня"

## (прычынак да высвятлення беларускае геральдыкі)

Шмат стагоддзяў мінае з таго часу, як на Беларусі пачаў ужывацца герб "Пагоня": на белым кані сядзіць удалы ваяка, у правай руцэ ён трымае высока падняты меч, у левай мае шчыт, на якім ёсць знак шасціканцовага крыжа, апрануты ён з галавы і аж да ног у жалезны панцыр-браню, на галаве жалезны шлем, які закрывае усё аблічча, украшаны дарагім квяцістым пяром, моцна і ўпэўнена трымаецца ён у сядле, вострымі астругамі паўзбуджае каня да бордзкага скоку. Куды ён спяшыць, ваяка удалы, на каго ён нападае, ці мо бароніцца ён ад каго?

Ваяка на белым кані, пачынаючы з XIII стагоддзя, а можа нават і раней і аж да канца XVIII стагоддзя, гэта быў сымбаль дзяржаўнай самастойнасці і незалежнасці беларускага народу; узнаўленне беларускае народнае дзяржаўнасці ў 1917 годзе — Першы Усебеларускі Кангрэс, на якім абвешчана было, што на ўсім абшары беларускае зямлі ўстанаўліваецца беларуская народна-рэспубліканская ўлада, — адбылося пад знакам старажытнага сымбалю: на бел-чырвона-белым сцягу ў залатых праменнях сонца ваяка на белым кані: гэта ёсць сымбаль дзяржаўнай незалежнасці Беларускай Народнай Рэспублікі.

Што азначае гэты сымбаль — ваяка на белым кані, хто ведае цяпер, які змест укладаўся ў гэты старадаўні сымбаль нашымі продкамі на ўсвеце гісторыі?

Спробуем адказаць на гэта пытанне.

На Беларусі, асабліва ў асяроддзі беларускага сялянства, існуюць аж па сённяшні дзень такія звычаі і ўрачыстыя абраднасці, якія сваім паходжаннем сягаюць у старажытнасць, або, як гэта кажуць, у даўно мінулыя часы паганства. Адным з такіх звычаяў з'яўляецца, напрыклад, урачыстае спатканне вясны і юр'яўскае свята. Юр'я, калі вітаюць вясну.

У старыя часы Юр'я спраўляўся вельмі гучна і слаўна і прыпадала на другую палавіну красавіка месяца, або на пачатак траўня па новаму стылю, калі распачыналіся першыя працы ў полі. Гэта было свята вітання бога сонца Ярылы.

Яшчэ ў канцы XIX стагоддзя, як сцвярджае А.Фаміцын, у свядомасці беларусаў, якія наогул захавалі ў абраднасці і вераваннях сваіх многа вельмі старадаўніх рысаў і матываў, — не пераставаў жыць Ярыла, у сэнсе бога вясенняга сонца (А.Фаміцын "Божество древних славян", Сп. б, 1884, с. 226).

Успаміны аб Ярыле захаваліся на Беларусі, як сцвярджае А.Афанасьеў, вельмі жыва: беларусы ўяўляюць яго маладым прыгожым хлопцам на белым кані і ў белай вопратцы, на галаве ў яго вянок з вясенніх палёвых кветак, а ў руцэ трымае жменю жытных каласоў, ногі ў яго босыя. Там, дзе ступаў старынны бог Ярыла сваімі босымі нагамі, то зараз жа вырастала густое жыта, а куды абрашчаўся ягоны пагляд — там расцвіталі каласы, а дзе ішоў ён нагою, там жыта калосіцца, а дзе ж ён не зірне, там колас зацвіце (А.Афанасьев "Поэтические воззрения славян на природу", том второй, Москва, 1865, с. 441-442).

Назва Ярыла захавалася на Беларусі аж да апошняга часу, сягае сваім паходжаннем аж у глыбах старажытнасці.

Слова Ярыла складаецца з кораня "яр", канцоўкі "ыла".

Корань "яр" адпавядае санскрыцкаму "ар", якому ў свой чарод адпавядае грэцкае "ер". "Ар" у санскрыце азначае дзейнасць узвышанаю, рух наверх; канцоўка "ыла", як скажоно "іла", але, маючы ў сабе суфікс мінулага часу прычасця дзейнага залогу, азначае безупынную дзейнасць, як пэўную ўласцівасць таго, што дзейнічае. Напрыклад: Купала, Вазіла, ні іначай і Ярыла.

Канчаючы "ыла" адпавядае " санскрыце "ван", якое ў свой чарод, прыраўніваецца да грэцкага...

У цэлым, славянскае слова — Ярыла, адпавядае санскрыцкаму "Арван", у пазнейшым санскрыце азначае — конь, але ў Ведах яно больш захавала свае першапачатковае значэнне — хуткі, бягучы, прыткі, імклівы. Гэта назва ў Ведах адносіцца да сонца і ўжываецца нават замест сонца, а інагды ужываецца ў сэнсе каня і

верхніка (усадніка, конніка). Гэны верхнік — узыходзячае сонца. Ёсць нават гімны ў Ведах аб сонцы, як аб кані.

Падобна санскрыцкаму “ар” славянскае “яр” таксама захаваў значэнне хуткасці, бягучасці, прыткасці, імклівасці, а таксама палкасці, сілы, святла, вясенняга, або ўзыходзячага сонца. Як і санскрыцкае “ара” азначае хуткі і прыткі, так і наша беларускае “яра” — хутка, прытка.

Галоўнае свойнасць святла ёсць хуткасць яго распаўсюджвання, у корані “яр” сумяшчаюцца значэнне хуткасці і святла.

Вясенні свет узбуджае ў прыродзе сілу адраджэння і аплоджання, дзеля гэтага “яр” ужываецца ў значэнні пладатворнай сілы вясенняга сонечнага святла.

Тое, што пад корнем “яр” трэба разумець свет вясенняга сонца, можна бачыць, напрыклад, з назвы вясны — яро, як гэта ўжываецца аж да апошняга часу ў чэшскай мове: адсюль назва веснавых пасеваў: ярына, яравое поле; у нямецкай мове, напрыклад, захавалася назва года: Jahz.

Вясна — гэта ёсць час, калі ўзбуджаецца імкненне да аплоджвання: ярун, ярыцца, ярыць. Апрача таго, вясенні свет узбуджае сілу, мужнасць. Корань “яр” дзеля гэтага ў сучаснасці, як і ў санскрыце азначае сілу, мужнасць, здатнасць: яры — гэта ўсё роўна, што сільны, мужны, здатны. Яросць — па-чэшску — свежасць, юнацкая сіла. З гэтуль паходзіць і яшчэ адно значэнне кораня “яр” — гнеўны, заўзяты, ярасны; адпавядае лацінскаму “ira”, а грэцкаму ..., што таксама азначае гнеўнасць, заўзятасць. У беларускай мове слова “ярасць” ужываецца ў сэнсе палкасці, жарчыстасці, гарачнасці. (В.Ластоўскі. Падручна расійска-крыўскі (беларускі) слоўнік. Коўна, 1924, с. 760)

Слова Ярыла, такім чынам, азначае хуткую распаўсюджанасць вясенняга святла, якое ўзбуджае сілу ўзросту ў травах, дрэвах, плоцкую сілу ў звяроў і людзей, а таксама — юнацкую свежасць, здатнасць, адвагу і храбрасць у чалавеку.

З гэтуль вынікае, што Ярыла, як увасабленне вясенняга сонца, з’яўляецца богам аплоджання, богам кахання, радасці, красы, сілы і дасканаласці.

Уява сонца ў вобразе каня ёсць супольна многім народам: у персаў, напрыклад — белы конь; у скандынаўскіх народаў — светлагрывы конь, ні іначай і ў славян, асабліва ў нашых народаў — белы конь.

Узнікла гэта ўява ў пастушаскія часы, калі ў вобразе розных звяроў увасабляліся сілы прыроды; гэта была эпоха зооморфізму. Напачатку землеробскае эпохі, калі пачаў узнікаць антрапамарфізм — увасабленне сілаў прыроды ў вобразе чалавека, народная фантазія, злучыла папярэдні зооморфічны вобраз з новым антропоморфічным: на белым кані быў пасаджаны малады чалавек, гэтак

з'явілася ўява маладога, прыгожага, удалага хлопца, які сядзіць на белым кані — ўява вясенняга сонца.

Уява сонца ў вобразе прыгожага юнака, які раз'язджае па свеце на белым кані, існуе таксама і ў іншых народаў: у індусаў — Вішна, у рымлян — Апалон, у персаў — Мітра.

Наш беларускі Ярыла, як бы сонца, уяўляецца не іначай, як у вобразе прыгожага юнака на белым кані.

Аж да апошняга часу, кажа П.Ефіменко, беларусы ўяўляюць сабе Ярылу маладым, прыгожым чалавекам, які раз'язджае на белым кані (П.С.Ефіменка "О Ярыле, языческом божестве славян" — Записки императорского русского географического общества по отделению этнографии, том второй, Сп./б. 1869, с. 83).

Вобраз Ярылы ўяўляўся беларусамі таксама і ў постаці дзяўчыны. Беларусы, кажа Ефіменка, у свята Ярылы прадстаўніком яго выбіраюць не хлопца, але маладую прыгожую дзяўчыну, якую апранаюць так, як уяўляюць сабе Ярылу і саджаюць яе на белага каня. (стр. 83) Аб гэтым сведчыць таксама і Дрэўлянскі ў сваей працы: "Белорусския предания" (Приложение к журналу Министерства народного просвещения) Сп/б., 1846, книга I, с. 20-21).

Уява бога сонца ў вобразе жанчыны, паходзіць, мабыць, з часоў матрыярхату, калі жанчына-матка ўважалася за прадстаўніка роду; не мужчына-бацька, а жанчына-матка стаяла на чале радавога супольства.

Нельга не адзначыць пры гэтым, што ў старадаўнія часы была вельмі пашырана ўява прыраўнення сонца з чалавекам: узыходзячае сонца прыраўнівалася з прыгожым дзіцяцем, паўдзённае сонца — з мужам поўналетнім, вячэрнея сонца — з старым дзедам. У выніку гэтага сонца ўвасаблялася ў розных вобразах: дзіцяці, юнака і старога дзеда. Узыходзячае сонца заўсёды ўяўлялася ў вобразе прыгожага дзіцяці на руках у маткі-зямлі. Гэтак: у індусаў — дзіця-сонца сядзіць на руках у маці-зямлі Лакшны, у егіпцян — дзіця-сонца сядзіць на руках у маці-зямлі Ізіды, у фрыгійцаў і ў рымлян — яно ўяўляецца з маткай Цыбелаю, у славян — сонца сядзіць на галаве Жывы або Сівы, у фінаў — на руках Залатой Бабы. Аб гэтым сведчыць між іншым і М.Кастамараў у сваёй працы "Славянская мифология" (с. 30-33).

На Беларусі, аднак, гэта ўява, у яе першапачатковай форме, не захавалася, поўнасцю можна сказаць была выцеснена ў народнай свядомасці, хрысціянскім вобразам Маткі Боскай Вострабрамскай, што пэўна-ж, па свайму паходжанню і першапачатковаму значэнню ёсць адно і тое ж — дзіця-сонца сядзіць на руках маткі-зямлі.

Ярыла, як бог вясенняга сонца, уяўляецца на Беларусі выключна ў вобразе прыгожага юнака, які сядзіць на белым кані: адзеты ў белую вопратку, на галаве ў яго

вянок з вясенніх кветак, у правай руцэ трымае людзкі чэрап — сымбаль перамогі над смерцю, у левай руцэ трымае жменю жытніх каласоў — сымбаль жыцця і ўроды, ногі ў яго босыя.

Гэта ёсць уява ўдалога і здатнага героя, які перамагае зло-зіму, як кажа І.Ружічка, нясе людзям дабро — свет вясенняга сонца (Юзэф Ружічка “Слованска міфологія”, Прага, 1907, с. 148).

У вобразе Ярылы, як яго ўяўляюць беларусы, злучаецца, на думку І.Снігірова, ідэя мужнасці, здатнасці і пажадлівасці, якая праяўляецца ў хлопцы, ў пладатворны час году — вясной, калі ўсё жывое, казаў той, бывае ў яру (І.Снігіроў “Русские простонародные праздники”, выпуск IV, Москва, 1838, с. 53-54).

Час панавання бога сонца Ярылы быў абмежаны — прадаўжаўся да Купалля, калі сонца дасягала найбольшага ўзвышша, з гэтага часу пачыналася ўжо панаванне бога Купалы.

Урачыстае святкаванне Ярылы пачыналася, звычайна, у той дзень, калі цяпер прыпадае Юр’я. Вясковая моладзь — хлопцы і дзяўчаты ў лепшай святочнай вопратцы збіраліся рана пры ўзыходзе сонца на вызначанае месца, прыбіралі Ярылу, спявалі пры гэтым песні, у якіх праслаўлялі бога сонца і вясну, пасля яны ўсей грамадой, у стройнай працэсіі, начале з Ярылам, адыходзілі на луг, дзе ладзілі гульні і розныя забавы.

Святкаванне бога сонца Ярылы адбывалася ў старадаўнія часы і ў іншых славянскіх народаў, але ў значна пачаненай форме (Махал “Накрес слованского баеслові”, Прага, 1891, с. 203).

Украінскае вясенняе свята Каструбы (М.Грушевский “История украинской литературы”, частка першая, Киев, 1923, с. 189-191), як і рускае свята Кастрамы (А.Афанасьев “Поэтические воззрения славян на природу”, том третий, с. 725-729) — гэта ёсць толькі водгук старадаўняга, мабыць яшчэ праславянскага ўрачыстага свята вясны, свята адраджэння прыроды і ўвакрашэння да новага жыцця. Гэта свята ў чыстай форме захавалася толькі на Беларусі, дзе паводле прафесара Любора Нідэрле, яшчэ ў перадгістарычныя часы была калыска славянства і скуль у наступным часе, пад уплывам розных чыннікаў, разышліся на захад, на ўсход і на паўдзённы захад усе славянскія народы: беларусы, застаўшыся на адным і тым самым месцы, спрадвечныя тубыльцы краіны ў вадазборніка рэкаў Дняпра, Сожа, Прыпяці, Нёману, Бярэзіны і Дзвіны — ад Ловаці і аж да Буга — захавалі ў чыстай форме не толькі свой анпроологічны славянскі тып, але і ўсе найбольш характэрныя асаблівасці славянскае культуры (Проф, др. Любор Нідэрле “Слованске старожытносці”, отдел І, связэк IV, “Пувор а початкі сло-

вану выходніх", Прага, 1924, с. 10-12, 132-139, 203-213.).

Уява бога сонца Ярылы ў вобразе прыгожага юнака на белым кані, захавалася толькі на Беларусі, гэта быў беларускі народны бог.

У іншых славян, кажа Афанасьеў, Ярыла вядомы быў пад назваю Яравіта, якога старынныя хронікі прыраўніваюць да Марса. Марс жа першапачаткова, грамавік, спраждаючы дэманаў, а затым — бог вайны. Як нябесны ваяка (бог ярасны, гнеўны), Яравіт уяўляўся з байовым шчытом, але разам з тым ён быў і тварцом усякае пладароднасці (А.Афанасьеў "Поэтические воззрения славян на природу", том першы, с. 443).

Уяўленне Ярылы у вобразе ваякі з байовым шчытом у руцэ не ёсць чужое для беларусаў: удалы ваяка на белым кані — гэта ёсць вобраз бога сонца Ярылы.

Калі і як адбылася ваенізацыя выявы бога сонца Ярылы, які спачатку быў мірным богам пастухоў, а затым — землеробаў, аб гэтым нельга сказаць нічога пэўнага; настала, мабыць, у эпоху вялікіх войнаў, калі мірная праца земляроба заменена была на вострый меч і байовы шчыт ваякі.

Эпоха, калі мірны бог Ярыла адзеў вайсковае убранне — гэта ёсць адна з найцікавейшых эпохаў у гісторыі беларускага народу: з усей праўдападобнасцю можна сцвярджаць, што гэта эпоха прыпадае на XII і XIII стагоддзі. Беларусы ў той час гераічна змагаліся на два франты супраць нападак нямецкіх крыжакоў з захаду і супраць татарскіх наездаў — з усходу. Гэта была вайна, як кажа М.Доўнар-Запольскі, у якой прымала учасце ўсё вольнае насельніцтва — смерды і баяры, увесь беларускі народ ішоў у паспалітае рушэнне дзеля абароны свае бацькаўшчыны (М.В.Доўнар-Запольскі "Государственное хозяйство Литовской Руси при Ягеллонах", с. 8-11).

Спосаб вядзення вайны спачатку быў чыста-чыста партызанскі. Беларусы вылаўлівалі чужацкіх наезднікаў, заганялі іх у лясы і балоты і там іх разбівалі. Але вораг быў напорысты, наезды нямецкіх крыжакоў і татарскіх багдыханаў адбываліся, звычайна, на конях, яны лёгка маглі пераязджаць з месца на месца і ўхіляцца ад боя там і тады, калі ім гэта было зручна, адыходзілі назад з тэрыторыі Беларусі, каб пасля ізноў, выбраўшы адпаведны час, знянацку напасці на мірнае земляробскае насельніцтва. Беларускае паспалітае рушэнне — пераважна пяхотнае сялянскае войска — павінна было рэарганізавацца ў адпаведнасці з умовамі часу і спосабам вядзення абарончае вайны: проці конніцы чужацкіх наездаў трэба было паставіць сваю конніцу і прагнаць ворага аж у глыбяж іх краінаў. Гэтак паложаны быў пачатак утварэння сталага беларускага войска. Беларускія коннікі неўзабаве воўкам леталі ад берагоў Балтыйскага і аж да

Чорнага мора і разбілі магутную сілу татараў і нанеслі руйнуючы удар нямецкім крыжакам пад Грунвальдам у 1410 годзе. Беларусь была вольная і ні ад кога незалежная дзяржава.

Утварэнне сталага коннага войска мела ў той час далекасягныя вынікі. Узнікла значная лікам група людзей, якія займаліся выключна толькі вайсковымі справамі, гэта былі ваякі-фахаўцы.

У наступным часе, паскольку справа абароны краіны і безупыннае вядзенне вайны прадаўжала быць першай і галоўнай справай у жыцці і дзейнасці супольства, ваякі-фахаўцы поступенна набывалі ўсе большае і большае моцы, занялі, нарэшце, вызначнае становішча ў супольстве і выдзяляліся ў асобны ўпрывілеяваны стан; у летапісах таго часу знаходзімо аб іх такія азначанні, як сеньорес, майорес, бані вірі. Сярод гэтых лепшых людзей не мала было, пэўна і патомных тых радавых старэйшын і тых родавых князькоў, аб якіх з вялікай любасцю апавядаюць нашы летапісы, большасць, аднак, складалася з удалых ваякаў паспалітага рушэння.

З ваякаў-коннікаў, такім чынам, узнікла новая радавітая шляхта, цікава між іншым, што слова “шляхта” паходзіць ад нямецкага слова — schladen біць, а нямецкае слова — schlacht — азначае бітва, даслоўны пераклад на беларускую мову слова “шляхта” азначае: байоўныя людзі, ваякі.

З узнікам шляхты на Беларусі ўзнікла новая зямельная арыстакратыя, за сваю службу ў войску ваякі-коннікі атрымлівалі землі, на якіх працавалі ўжо з таго часу запрыгоненыя сяляне-землеробы.

Вярхі шляхты — магнаты, займалі высшыя пасады ў дзяржаве і з’яўляліся раднікамі князя, уваходзілі ў склад дзяржаўнае рады; нізы былі звычайнымі падданымі — А.Ц., ім дано было права самарадавання, што наяўна выяўлялася ў павятовых і земскіх соймах. У наступным часе ўсе справы і вольнасці шляхты былі кодыфікаваны, у зборніку законаў, які мае назву “Літоўскі Статут”. Чаму так сталася і скуль паходзе гэта назва “Літоўскі”, “Літва”, існуюць розныя думкі, дакладна пагаворымо аб гэтым пры разборы Літоўскага Статуту. Адно тут скажамо: хай нас не блытаюць назвы, справа не ў назве, а у нечым іншым, шукайма канкрэтна змест гістарычных падзей.

У абставінах вайны з нямецкімі крыжакамі і татарскімі багдыханамі, упартае і заўзятае вайны, якая вымагала напружанняў усіх сілаў і вялікай самаахвярнасці, злучаліся і аб’ядноўваліся дзеля абароны свайго жыцця і маемасці се спародняные славянскія пляменні на вагромністым абшары ад Ловаці і аж да Буга, гэтак на рубяжы XII і XIII стагоддзяў узнікла беларуская дзяржава з цэнтрам у Навагрудку. У наступным часе, пасля адстырчання нямецкіх крыжакоў на захад, сталіца незалежнай



2

беларускай дзяржавы перанесена была ў Вільню. Прыгожае места Вільня, пабудаванае ў далекай мінуўшчыне на шляху гандлевай пераправы праз раку Віллю, прадаўжала быць галоўным цэнтрам Беларусі аж да часу заняпаду беларускае дзяржаўнасці ў канцы XVIII стагоддзя.

Беларуская шляхта як упрывілеяваная супольная група ваякаў-коннікаў, маючы свае паходжанне ў мінуўшчыне з паспалітага рушэння ўсяго земляробскага народу, уважала сябе за "шляхецкі род", але культурна і псіхалагічна захавала ўсе старадаўнія звыкі і вераванні; успрынятае ў той час хрысціянства не мела спачатку значнага ўплыву на культурную свядомасць беларускага народу.

Гэтак, калі для беларускага селяніна-земляроба ідэалам здатнасці, красы і сілы прадаўжае быць прыгожы хлопец на белым кані, адзеты ў белую сялянскую вопратку, з вянком палявых кветак на галаве і жменей жытніх каласоў у руцэ, то для ваякі-шляхціча ідэалам здатнасці, красы і сілы ёсць ваяка на белым кані, адзеты у жалезны панцыр, з высока паднятым мячом у правай руцэ, з байоўным шчытом у левай руцэ, жалезным шлемам на галаве, які аздоблены квяцістым пяром, з жалезнымі астругамі на ботах.

Як бачым, гэта ёсць нішто іншае як звычайны соцыямарфізм, старадаўні бог сонца Ярыла адзеваецца ў розныя вопраткі.

У вобразе ваякі на белым кані мы бачымо бога сонца Ярылу і ў дзяржаўным гербе Беларусі.

Уява ваякі на белым кані ў дзяржаўным гербе Беларусі — гэта ёсць наяўнае сведчанне аб тым, што ваякі-коннікі стаялі начале дзяржаўнага будаўніцтва беларускага народу. І ў гэтым няма нічога дзіўнага, так узнікалі на ўсвеце гісторыі ўсе еўрапейскія дзяржавы.

Уява старадаўняга бога Ярылы сустракаецца і ў іншых гербах на Беларусі, у беларускай геральдыцы гэта ёсць звычайная справа.

Паўзіраемся, напрыклад, на герб Скарыны: на паўкруглым шчыце чалавечае аблічча — лоб, вочы, нос і шчокі, вочы ўзіраюцца проста, адважна і мудра; на ўсе бакі ад аблічча веерам разыходзяцца вогненыя пасмы святла, правы бок аблічча, частка шчакі знізу ўверх засланяецца іншым абліччам, якое абернута бокам і ўзіраецца кудысьці ўніз напружана і гнеўна. Што гэта азначае — мо перад намі двулікі Янус?

Не, гэта ёсць увасобленне святла і цемры, або, як гэта кажуць, сонца і месяца, гэта ёсць вобраз узыходзячага сонца, якое праганяе начную цемрадзь.

Інакш кажучы, у гербе Скарыны з'яўляецца перад намі старадаўні вобраз бога сонца Ярылы ў адменным уяўленні і ў іншай надобе, гэта ўжо не вобраз прыгожага хлопца ў сялянскай вопратцы, ні вобраз ваякі на белым кані,

але вобраз людзкога аблічча, вочы якога ўзіраюцца проста, адважна і мудра, гэта ёсць увасобленая мудрасць, сусветны логос, спрадвечны творчы розум.

Гэткае ўсць уяўленне старадаўняга бога сонца Ярылы ў першага беларускага інтэлегента-народніка доктара Францішка Скарыны.

М.Шчакаціхін уважае, што герб Скарыны мае сваё паходжанне ў зацьменні сонца, гэту сваю думку ён абапірае на тым, што сонца ў гербе абкружана праменнямі-пратуберанцамі, якія можамо спасцярагаць толькі ў часе сонечных зацьменняў. Устанаўлівае паводле гэтага і дзень нараджэння Францішка Скарыны, сына Лукі, кушніра з Полацку, 6 сакавіка 1486 годзе, у той дзень, калі адбылося зацьменне сонца, якое можна было спасцярагаць у Полацку. Гэта, маўляў, ёсць дзень нараджэння Францішка Скарыны, згэтуль паходзіць і герб Скарыны: зацьменне сонца (М.Шчакаціхін, Калі нарадзіўся Францішак Скарына "Полымя", Менск, 1925, № 5, с. 148-151.

Думка М.Шчакаціхіна не пазбаўлена дасціпнасці. І ўзапраўды, хіба можна пярэчыць таму, што 6 сакавіка 1486 года адбылося зацьменне сонца, якое можна было спасцярагаць у Полацку і што ў той дзень мог нарадзіцца Францыск Скарына, ні маючы шляхетнага гербу, бо паходзіў з паспалітага люду, узяў сабе ў герб матыў зацьмення сонца, гэты матыў поўнасцю мог адпавядаць уяўленню старажытнага бога сонца Ярылы, які змагаецца з цемрай.

Тое, што ў дзень нараджэння Францішка Скарыны магло адбыцца зацьменне сонца, або, наадварот, у дзень зацьмення сонца мог нарадзіцца Францішак Скарына далёка яшчэ не азначае таго, што герб Скарыны ёсць толькі прыпадковае астралагічнае здарэнне — зацьменне сонца; мае глыбейшы сэнс і сусветна-касмічнае значэнне*. З усей яскравасцю аб гэтым сведчыць ужо нават хоць бы і тое, што ў Біблії, якую пераклаў Францішак Скарына на беларускую мову і выдаў друкам у Празе, сярод розных гравюр і аздобаў вельмі часта сустракаецца чалавечае аблічча, вочы якога ўзіраюцца проста, адважна і мудра, гэта абліча мы бачымо і на гравюры, дзе змешчаны партрэт Скарыны, згэтуль узнікла думка, што гэта, маўляў, ёсць герб Скарыны. У рэчаістасці — гэта ёсць вобраз старадаўняга бога сонца Ярылы.

Беларуская геральдыка ёсць вельмі багатая, мо найбагацейшы скарб народнае творчасці, існуе вагромністае мноства

---

*Развагі д-ра Тамаша Грыба аб паходжанні герба Ф.Скарыны, уяўляюцца цікавай спробай тлумачэння, але яны не бясспрэчныя. Іншая версія ўзнікнення сімвала звязваецца з мескім Капенгагенскім гербам, дзе працаваў, вучыўся і спасцігаў друкарскую справу наш выдатны зямляк. Гл. падрабязней — Цітоў А.*

*Пашукаем у гісторыі. — Мастацтва Беларусі, 1989, 8 (А.Ц.).*

гербаў, якія ўжываліся рознымі асобамі і станамі беларускага супольства, як пэўныя сымбалі — знакі іх здатнасці, красы і сілы. Але ў кожным беларускім гербе, пры ўвомлівым яго разглядзе, знойдземо таемны знак бога сонца — гэта ёсць старадаўні сымбаль бога сонца Ярылы.

Паводле гербаў, якія ўзніклі на Беларусі можна вывучаць гісторыю развіцця беларускае культуры і ад даўнейшых часоў і аж да нашых дзён, спасцярагаемо ў іх вобразы-уяўленні пазнейшых уплываў хрысціянскае цывілізацыі. Наяўна гэта бачымо ў дзяржаўным гербе “Пагоня”, мілітарызаванае ўяўленне бога сонца Ярылы дапоўнілася знакам хрысціянскае цывілізацыі: на байоўным шчыце ў ваякі на белым кані з высока паднятым мячом у правай руцэ пастаўлены быў шасціканцовы крыж. Хрысціянская цывілізацыя з яе касцёльна-царкоўнай сымболікай, вядзе напорыстае змаганне ў цягу стагоддзяў з культурнай спадчынай паганства, паспела ўжо знішчыць шмат вялікіх каштоўнасцяў самастойнае творчасці беларускага народу.

Пад уплывам касцёльна-царкоўнае сымболікі змянілася вобразатворнасць беларускага народу, значна змянілася і першапачатковае ўяўленне бога сонца Ярылы, вясенняе свята Ярыла змянілася ўжо на Юр’я.

Але ў песні народнай, якую спявае беларуская моладзь на Юр’я, вобраз Ярылы застаецца ў поўнай красе і свежасці “Разыграўся Юра конік — залаценькі конік”.

Нашы старадаўнія продкі, як сведчыць П.Ефіменка (с. 101) злучалі ўяўленні святла з барвамі залатымі, белымі і чырвонымі, а ўяўленне цемры злучалі з барвамі цемнымі і чорнымі. У залаценькім коніку, дзеля гэтага нельга не бачыць вясенняга сонца — Ярылу — у яго першапачатковым зооморфічным вобразе.

Белы конь, або залаценькі конік, у народным уяўленні, белы конь у дзяржаўным гербе “Пагоня” — хіба гэта ні ёсць наяўны паказ узапраўднага паходжання герба “Пагоня”.

Белы конь у залатых праменнях сонца — гэта ёсць вобраз сілы, красы і здатнасці, гэта ёсць сымбаль адраджэння і ўваскрасення да новага жыцця.

Ваяка на белым кані — гэта ёсць сымбаль перамогі.

Белая барва, як уяўленне святла, вельмі пашырана ёсць на Беларусі, згэтуль, мабыць, паходзіць і назва Беларусі — белая, чыстая, вольная, як свет сонца.

Ня менш пашырана ёсць на Беларусі і чырвоная барва, як чырвоны ёсць золак на небе перад узыходам сонца, згэтуль наш бел-чырвона-белы сцяг адраджэння і вызвалення беларускага народу.

**Часопіс “Іскры Скарыны”,**
**Прага, 1935, N 5.**

*Анатоль ЦІТОЎ*

# Дык хто ж ён, "збройны рыцар на кані"?

***Гэты артыкул быў напісаны ў адказ на спробу кампарцейных уладаў БССР зганьбіць наш старадаўні сімвал (гл.: В.Бегун. Переосмысление символа. Политический собеседник, 1987, № 5), таму ў ім прасочваецца адрасная апеляцыя да апанента. (А.Ц.).***

Вось ужо дваццаць гадоў займаюся геральдыкай і сфрагістыкай (навукай аб пячатках) Беларусі, таму ў 5-ым нумары часопіса "Политический собеседник" за гэты год мяне вельмі зацікавіў артыкул У.Бегуна "Переосмысление символа", прысвечаны, у прыватнасці, беларускаму гербу "Пагоня".

На жаль, гісторыя гэтага герба дагэтуль не распрацавана, хоць налічвае ўжо 700 гадоў. "Пагоня", як сцвярджаецца ў артыкуле "воспринимается нами как эмблема национализма и пресмыкательства перед иностранными хозяевами".

Узнікае пытанне — кім "нами"? Хацелася б нагадаць: "Пагоня" як афіцыйны герб з'явілася яшчэ на пачатку фарміравання беларускай нацыі. Менавіта пад сцягамі з выявай "Пагоні", пра што сведчаць летапісы і старажытныя аўтары, адбівалі нашы далёкія продкі напады ворагаў — крыжакоў і крымчакоў. (У Густынскім летапісе чытаем, што вялікі князь Віцень, які княжыў у 1293 — 1316 гг., "ізмыслі себе герб і всему князству літовскому печать: рыцер збройный на коне з мечем, еже ныне нарічут погоня".)

Пад сцягамі з "Пагоняй" біліся беларускія, літоўскія, украінскія і рускія палкі. Разам з польскімі яны перамаглі крыжакоў у Грунвальдскай бітве, спыніўшы нямецкую экспансію на Ўсход. Пад прапарамі з "Пагоняй" змагаліся паплечнікі Кастуся Каліноўскага, а граф Мураўёў-вешальнік выдаваў цыркуляры, забараняючыя ўжыванне "рэвалюцыйных знакаў" з гэтай выявай.

Неправамерна, нельга атаясамліваць паняцце "герб "Пагоня" ўвогуле і канкрэтны герб з той жа назвай, які належаў пэўнай групоўцы.

Ніхто не заклікае ўводзіць ва ўжытак герб БНР або тую "Пагоню", якую насаджалі калабарацыяністы ў час Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі акупіраванай Беларусі. Не! Але сама ідэя і сэнс абароны Бацькаўшчыны ад ворагаў, закладзеныя нашымі прашчурамі ў гістарычныя сімвалы, жыве і будзе жыць. Паводле логікі аўтара прыгаданага артыкула, мы павінны былі б адмовіцца і ад пяцікутнай зоркі, бо яе чаканіў на медных манетах царскі ўрад. Гарматы, аздобленыя пяцікутнай зоркай, яшчэ зусім нядаўна абстрэльвалі Ліванскае і Лівійскае ўзбярэжжа, а самалёты з такой жа зоркай на фюзеляжы кідалі бомбы на гарады і вёскі В'етнама. Але тая зорка — у адрозненні ад нашай — не чырвонага колеру, а белага.

Адзін з галоўных законаў геральдыкі забараняе існаванне аднолькавых эмблем і гербаў. Гэты ж закон падкрэслівае, што наданне хоць бы адной, нават самай дробнай дэталі нараджае ўжо новы герб, які нельга ідэнтыфікаваць з папярэднім ці падобным яму. У нашым выпадку змена вопраткі, баявога рыштунку конніка альбо збруі, адпаведна геральдычным канонам, дае новы герб, не звязаны з той а бо іншай групоўкай ці арганізацыяй.

Незразумела, дарэчы, пра які юбілей БНР гаворыцца ў артыкуле "Переосмысление символа". Як вядома, БНР была абвешчана ў сакавіку 1918 г., г. зн. "юбілей" будзе на наступны год. Варта было б больш дакладна інфармаваць пра тое, што маецца на ўвазе.

Яшчэ больш незразумелыя згаданыя аўтарам "раздзелы (Вялікага Літоўскага — **А.Ц.**) княжества". У класічнай і сучаснай гістарычнай літаратуры існуюць тэрміны "падзелы Польшчы", альбо "падзелы Рэчы Паспалітай", што з'яўляецца цалкам правільным. Рэч Паспалітая была тройчы падзелена паміж Аўстрыяй, Расіяй і Прусіяй — у 1772, 1793 і 1795 гг. .У выніку падзелаў амаль уся тэрыторыя ВКЛ і большая частка Правабярэжнай Украіны былі далучаны да Расійскай імперыі. Падзелаў жа Вялікага княства Літоўскага не было.

Далей пішацца, што пасля "раздела этого княжества

она ("Пагоня" — **А.Ц.**) изображалась на гербах и хоругвях воеводств и городов". Тут зноў недарэчнасць — пасля падзелаў Рэчы Паспалітай, на той частцы, якая апынулася ў складзе Расіі, была ўведзена новая адміністрацыйна-тэрытарыяльная структура - ваяводствы скасаваны, а замест іх уведзены губерні. Яны атрымалі адпаведныя геральдычныя знакі, і толькі Віленскай і Віцебскай былі пакінуты гербы з выявамі "Пагоніў.

Што ж датычыць гарадоў, дык, сапраўды, некаторым з іх, асабліва ў паўночна-ўсходняй Беларусі, былі нададзены гербы з "Пагоняй". Але, каб не парушаўся першы закон геральдыкі — палі гэтых гербаў былі афарбаваны ў розныя колеры. Увогуле, гэта з'яўляецца, з аднаго боку, прыкладам таго, як герб з аднолькавай назвай можа належаць розным уладальнікам, а з другога, — адлюстраванне тэндэнцыі, характэрнай для палітыкі царызму — надаваць гербы, якія б знішчалі адметныя рысы гарадо і падганялі ўсё пад агульны ранжыр. Калі захаванне за некаторымі губернямі "Пагоні" — зямельнага герба — было цалкам зразумелым, дык наданне яе гарадам было часцей за ўсё актам прымусовым.

На заканчэнне хочацца выказаць шкадаванне, што на старонках друку з'яўляюцца публікацыі, якім не хапае гістарычнай дасведчанасці ў развагах на такую тэму, як сімволіка і геральдыка.

**Літаратура і мастацтва,**
**1987, 18 снежня.**

*Гергі Штыхаў*

# Што ведаць, чым ганарыцца*

Рэдакцыя "ЛіМа" звярнулася да мяне з просьбай зрабіць агляд лістоў, дасланых чытачамі ў сувязі з пытаннем, як адносіцца нам да старажытных сімвалаў і перш за ўсё да герба "Пагоня". Спроба выкарыстання такога сімвала, як і бела-чырвона-белага сцяга, прадстаўнікамі самадзейнага аб'яднання "Талака" выклікала вострыя спрэчкі.

Пішуць у "ЛіМ" людзі розных прафесій. Адны лісты на 2—3, другія на 10 старонках машынапісу. Ліст М.Купавы ўяўляе сабой сапраўднае даследаванне на палову аўтарскага аркуша.

Ва ўсіх лістах асноўная думка адна: у справе аховы помнікаў гісторыі і культуры, роднай мовы і нацыянальнай сімволікі "Талака" абняслаўлена ў неаб'ектыўных публікацыях беспадстаўна.

А.Хадыка з Мінска з болем разважае: "Быццам усе мы, а ў першую чаргу "Талака", вінаватыя ў тым, што да нашай гістарычнай памяці дакраналіся крывавыя рукі". Ён канстатуе, што ў выніку мы засталіся ў хвасце дыскусіі аб нацыянальнай сімволіцы.

Востра палемізуе з Б.Залескім, М.Ільюшэнкам і тымі, хто іх падтрымлівае ў надрукаваных артыкулах, Я.Лецка, папракае іх у неаб'ектыўным, тэндэнцыйным падыходзе да дзейнасці "Талакі". Ён піша: "Калі мы сустракаемся з фактамі наацыянальнага нігілізму, то нельга з пагардай глядзець на іх носьбітаў... Вінаватыя ўмовы, якія фарміравалі іх псіхалогію і іх светапогляды. Будзем па-

* *Гэты каментар падрыхтаваны па лістам, якія прайшлі ў рэдакцыю ў адказ на нападкі "вучоных марксісцка-ленінскіх навук" на нашы духоўныя і гістарычныя каштоўнасці. — А.Ц.*

мятаць, што фарміраванне гэтае адбывалася на працягу доўгіх стагоддзяў паднявольнага існавання, калі нашых продкаў пераконвалі, што яны, іх культура і мова ніжэйшыя і горшыя за іншыя". У гэтых словах ёсць горкая праўда.

А.Аблажэй з Вільнюса піша, што і для беларусаў "наступіў час падняць з бруду, куды яго ўтапталі прыслужнікі фашыстаў, бела-чырвона-белы сцяг, які мае старажытныя карані. Так, як гэта зрабілі са сваімі нацыянальнымі сцягамі літоўцы, латышы, эстонцы".

В.Багрый з Кіева абураецца артыкулам "Чаго хочуць "талакоўцы"?" і сцвярджае: "У.Гойтан, напэўна, забыўся, што фашысты займаліся на Беларусі не развешваннем трохкаляровых сцягоў, а генацыдам, ганьбаваннем усіх святынь беларускага народа".

Ад сябе хачу сказаць, што публікацыя У.Гойтана ўражвае не толькі сваімі параўнаннямі і метафарамі, выкарыстанымі супроць "талакоўцаў", але экскурсам у недалёкае мінулае, адлюстраваным у фотаздымках, зробленых у часова акупіраваным фашыстамі Мінску. Партрэт беснаватага фюрэра... і выява імклівай "Пагоні". У такім пасажы — злая іронія лёсу, незалежна ад намераў таго, хто рабіў здымкі. Напэўна, функцыянеры нацысцкай партыі не ведалі, у якіх гістарычных умовах узнікла "Пагоня", што адлюстроўвала. Аб паходжанні герба будзе гаворка ніжэй.

Сярод аматараў геральдыкі існуе меркаванне, што выява конніка з мячом, звернутая ў левы бок, па-свойму сімвалічная і скіравана супроць з'явы, вядомай пад назвай "націск на Усход". Менавіта так павернуты коннік на здымках, аб якіх ідзе гаворка.

Аўтар ліста ў "ЛіМ" І.Чарняўскі тлумачыць стварэнне самадзейных суполак тым, што "людзям хранічна не хапае гістарычнай інфармацыі, культуры, ведаў пра сябе. Яны імкнуцца знайсці нешта большае, чым ёсць у падручніках, стараюцца адшукаць тлумачэнні шмат якім складаным гістарычным падзеям і з'явам, якія прымітыўна раскрываюцца ў гістарычнай навуковай літаратуры".

Справядлівасць гэтых слоў можна пацвердзіць прагай моладзі да ведаў аб геральдыцы — навуцы ў нас амаль забытай. Гістарычнае значэнне герба "Пагоня" многім уяўляецца нечым такім, што знаходзіцца пад пакрыццём неадольнай таямніцы "за сямю пячаткамі", або, калі хочаце, забароны.

У сваіх развагах аўтары з Лепеля У.Шушкевіч, М.Гарбачоў, В.Быкаў, сталыя людзі розных заняткаў — карэспандэнт райгазеты, старшы інжынер і рабочы слесар — спачуваюць "талакоўцам", лічаць, што іх крыты-

куюць і зневажаюць несправядліва. Натхнёныя дзейнасцю "Талакі", яны ў Лепелі стварылі ініцыятыўную групу па прапагандзе беларускай мовы, якая распрацавала спецыяльную праграму, узгодненую ў райкоме партыі. У выніку ў горадзе ўжо з'явіліся першыя шыльды на роднай мове. Далейшага вам плёну, сябры!

А.Якімовіч з вёскі Касцяёва, што на Слонімшчыне, прыходзіць да вываду: "Не, не проста на сімвалы нападае У.Гойтан. Нападае ён на тых, хто імкнецца адрадзіць сваю культуру".

М.Купава клапоціцца аб неабходнасці вывучэння і выкарыстання беларускай нацыянальнай сімволікі (герба "Пагоня", сцяга). Ён прыводзіць прыклады з міжнароднага вопыту. Польшча, Чэхаславакія, Балгарыя і іншыя сацыялістычныя краіны карыстаюцца старажытнымі сімваламі ў якасці сучаснай дзяржаўнай сімволікі.

Цікавы факт з мінулага стагоддзя. Паўстанцы К.Каліноўскага змагаліся пад сцягам з выявай "Пагоні". Яна была адлюстравана на спражках, бляшаных знаках, на шапках паўстанцаў, а таксама з'яўлялася неад'емным элементам пячатак. Мураўёў-вешальнік выдаў загад карнікам знішчыць "Пагоню" як рэвалюцыйны сімвал.

У наш час "Пагоня" з'яўляецца элементам герба горада Беластока, дзе ці не большасць насельніцтва — беларусы. Фірменны поезд Беласток—Варшава называецца "Пагоня". М.Купава, наш ужо вядомы мастак, піша: "...існуе пэўная мастацкая заканамернасць, якая грунтуецца на традыцыях народнай эстэтыкі. Яе лёгка прасачыць на прыкладах беларускага народнага адзення, народнага ткацтва і вышыўкі, дзе чырвоны арнамент наносіцца на белае поле (рушнік, фартух). Гэтая традыцыя вельмі старажытная, і з'яўленне бела-чырвона-белага сцяга заканамерна вынікае з той жа самай эстэтычнай крыніцы. У 20—30-х гадах бела-чырвона-белы сцяг у Заходняй Беларусі ва ўмовах буржуазнай Польшчы разглядаўся і ўспрымаўся польскімі ўладамі як рэвалюцыйная адзнака, як сімвал свабоды і незалежнасці беларускага народа".

Хвалюе і прымушае задумацца ліст, прысланы з горада Казяц-Руда Літоўскай ССР. Яго аўтар — сакратар партыйнага камітэта доследнага камбіната драўляных вырабаў А.Мінін. Ён абураецца публікацыяй у газеце "Звязда" артыкула, які па яго словах, "ачарняе сімвал літоўскага і беларускага народаў — старжытны герб "Пагоня". У канцы ліста А.Мінін піша: "Турбуе факт, што калі ў Савецкай Літве герб "Пагоня" афіцыйна прызнаны як паўнапраўны сімвал нацыянальнага гонару народа, у "Звяздзе" друкуецца матэрыял, які фарміруе ў чытачоў адносіны да "Пагоні" як да двайніка гітлераўскай свастыкі.

Працоўныя Літвы і Беларусі — даўнія партнёры па сацыялістычным спаборніцтве, у іх моцныя гістарычныя сувязі і багатыя рэвалюцыйныя традыцыі, і нельга дапусціць, каб хтосьці падобнымі публікацыямі спараджаў узаемны недавер паміж братнімі народамі".

Такі папрок трэба аднесці і да прэтэнцыёзнага артыкула У.Бегуна, надрукаванага ў майскім нумары "Политического собеседника" за мінулы год, дзе ён паспяшаўся абвясціць "Пагоню "эмблемай нацыяналізму і рабалепства перад замежнымі гаспадарамі — раней гітлераўскімі, сёння амерыканскімі".

У артыкуле нават указаны "вінаватыя": герб выкарыстаны пры афармленні кафэ "Траецкі пернік" у Мінску і пакояў у інтэрнаце завода па апрацоўцы спартыўных тавараў у Маладзечне. Вынік выступлення У.Бегуна — ліквідацыя выявы "Пагоні"** на фасадзе будынка кафэ ў Траецкім прадмесці.

Між тым, незадоўга да гэтага ў газеце "Известия" быў надрукаваны здымак кафэ з выразнай "Пагоняй" — як станоўчы прыклад узнаўлення старажытных помнікаў у Беларусі.

Мне даводзілася часта сустракацца з літоўскімі калегамі на навуковых нарадах, чуць і бачыць на свае вочы, з якім тактам суседзі-гісторыкі, усе вучоныя выступаюць пры абмеркаванні розных пытанняў і асабліва тых, якія датычаць нацыянальнай свядомасці, памяці народа. А нашы? Як жа так можна? Дзеля чаго яны гэта робяць?

Адказ знаходзім у лісце М.Купавы: "Падкінуўшы і раздзьмуўшы праблему з "Пагоняй" і сцягамі, антыперабудовачныя сілы імкнуцца адцягнуць увагу грамадскасці ад надзённых праблем: дэмакратызацыі, абнаўлення ўсіх сфер жыцця..."

Нядаўна ў газеце "Правда" надрукавана інфармацыя пра сімвалы дзяржаўныя і нацыянальныя. У Вільнюсе на вежы Гедыміна 7 кастрычніка быў узняты трохкаляровы сцяг побач з дзяржаўным сцягам. Аднаўляюцца старыя народныя святы: Дзень маці, Дзень памяці памёршых і іншыя. Літоўскую мову вырашана аб'явіць дзяржаўнай. Выкарыстанне нацыянальнай сімволікі, таксама як і роднай мовы, узбагачае людзей, культурнае жыццё народа.

У сувязі з гэтым не патрабуюць асаблівых каментарыяў думкі, выказаныя ў лісце Г.Сагановіча: "Ніхто не аспрэчвае таго факта, што ў часы Вялікай Айчыннай "Пагоню" і бела-чырвона-белы сцяг выкарыстоўвалі калабарацыяністы. Але ж гісторыя Беларусі пачалася не ў 1941 годзе... "Пагоня" вякамі была неадлучнай ад палітычна-

---

*** Заўважым, што там была не выява "Пагоні", а шыльда на якой быў намаляваны вершнік з пугай у руцэ. Але звышпільныя цэнзары ўбачылі і тут "националистический сивол"! — А.Ц.*

культурнага жыцця нашага і братняга літоўскага народаў, жывіла іх жыццястойкасць ідэяй-заклікам "абароны Бацькаўшчыны ад ворагаў". Сімвалы за здраднікаў не адказваюць. Калабарацыяністы ў народа не пыталіся дазволу... Недальнабачна раптам рабіць крамолу з "Пагоні", абвяшчаць яе нацыяналістычнай і атаясамляць з ганебнымі, злачыннымі справамі калабарацыяністаў".

Застаецца толькі прыгадаць, з якімі ворагамі заклікала змагацца "Пагоня", дзе вытокі сімвала, якое дачыненне маюць да яго беларусы.

Герб "Пагоня" набыў асаблівае значэнне ў Вялікім княстве Літоўскім. Поўная назва гэтай феадальнай дзяржавы з XV стагоддзя — Вялікае княства Літоўскае, Рускае, Жамойцкае. Цэнтрам яе быў спачатку Навагародак (Навагрудак), з 1328 г. Вільня. Дзяржава існавала на тэрыторыі Літвы і Беларусі ў XIII—XVIII стагоддзях, Украіны да 1569 года і невялікай часткі Расіі да 30-х гадоў XVI стагоддзя. Беларускія і ўкраінскія землі тады называлі "рускімі".

Ф.Энгельс адзначыў, што беларускія і ўкраінскія землі знайшлі сабе абарону ад навалы заваёўнікаў, "далучыўшыся да так званага Літоўскага княства". Вялікія князі літоўскія не мелі дастатковых сацыяльна-эканамічных і палітычных сродкаў для трывалага падпарадкавання Беларусі і Украіны. Таму яны абавязваліся тут не рушыць "старыны" і не ўводзіць "навіны". Вялікае княства было федэратыўнай дзяржавай, у складзе якой завяршылася фарміраванне беларускай і ўкраінскай народнасцей. З другой паловы XIV стагоддзя беларуская мова становіцца тут дзяржаўнай мовай. Грамадзяне дзяржавы называліся "ліцвінамі".

Прыгадаем тое, як усходнім славянам сумесна з лівамі і латышамі давялося змагацца супроць крыжаносцаў — нямецкіх, дацкіх, шведскіх рыцараў-заваёўнікаў, калі яны ўварваліся ва Усходнюю Прыбалтыку ў пачатку XIII стагоддзя. Улічваючы грозную небяспеку, славянскія і прыбалтыйскія народы аб'ядноўвалі свае сілы і наносілі ўдары па варожых полчышчах. Заваёўнікі разглядалі Прыбалтыку, як зручны плацдарм для "націску на ўсход". Грабежніцкія паходы прыкрываліся ідэяй распаўсюджання хрысціянства сярод язычнікаў Прыбалтыкі і "схізматыкаў" Русі.

Крыху пазней пачалося наступленне крыжаносцаў у Прывісленне. У 1217 годзе быў аб'яўлены крыжовы паход супроць язычнікаў прусаў і літоўцаў. Крыжаносцы былі злейшымі ворагамі незалежнасці народаў Прыбалтыкі. Рыцары намерваліся каланізаваць іх, каб потым працягваць свой заваёўніцкі паход на Русь.

Барацьба з нямецкай агрэсіяй не сціхала на працягу

ўсяго XIII стагоддзя. Палачане прымалі ўдзел разам з войскам літоўскіх князёў, латышамі і эстонцамі ў бітве супроць захопнікаў каля возера Дурбе ў 1260 годзе. Палачане на чале з князем Таўцівілам дапамаглі наўгародцам і пскавічам нанесці паражэнне крыжаносцам і адбіць Юр'еў (Тарту).

Пачатак стварэння Вялікага княства Літоўскага звязаны з імем Міндоўга. У сярэдзіне XIII стагоддзя ён аб'яднаў некаторыя літоўскія і беларускія землі. Яго пераемнікі працягвалі палітыку ўмацавання дзяржавы і пашырэння яе тэрыторыі. Бесперапынна даводзілася адбіваць напады крыжаносцаў, якія аб'ядналіся ў ваенна-палітычны саюз — Тэўтонскі ордэн.

У сярэдневяковым грамадстве тых часоў сімвалы, гербы мелі значэнне не толькі сацыяльна-палітычнае, але і непасрэдна практычнае.

Гербы размяшчалі на шчытах, сцягах (харугвах), сёдлах, шлемах. Рабілася гэта па дзвюх прычынах. Па-першае, дзеля таго, каб у паходзе ці на вайне распазнаць па гербу і сцягу сваіх сярод чужых. Па-другое, у тую сярэдневяковую эпоху герб лічыўся знакам воінскай доблесці. Ён меў дэвіз — кароткае выказванне, якое тлумачыла сэнс эмблемы.

Паводле Густынскага летапісу, Віцень "нача княжити над Литвою измысли себе герб и всему княжеству печать: рыцер збройный на коне с мечом, еже ныне наричут погоня".

У дакуменце 1387 года растлумачваецца дэвіз герба і падкрэсліваецца, што, паводле народнага разумення, "пагоня" — гэта праследаванне ворагаў, каб яны ўцякалі з нашай зямлі. У барацьбе з крыжаносцамі павінна было ўдзельнічаць усё мужчынскае насельніцтва, здольнае насіць зброю, а не толькі ваенныя. У другой крыніцы — "Хронiцы Літоўскай і Жмойцкай" — пацвярджаецца: "в гербе муж збройный, на коню белом, в полю червоном, меч голый, яко бы кого гонячи держал над головою, и есть оттоля названный "погоня"."

Невыпадкова ў лепапісе "Хронiцы Быхаўца" адзначана, што князь Нарымунт таксама меў герб "человека на коне с мечом". Нарымунт — Глеб Гедымінавіч з'яўляўся ўдзельным князем пінскім і князем полацкім. Захавалася яго пячатка на дагаворы Полацка з Рыгай 1338 г. На правым яе баку адлюстраванне князя з мячом на кані, на левым — надпіс: "Печать княжа Глебава".

Каб зразумець пачатковы сэнс сімволікі "Пагоні", прыгадаем зноў гісторыю. Віцень княжыў з 1293 да 1316 года і знаходзіўся ў Навагародку. Ён умацоўваў дзяржаву, абапіраючыся на Навагародскае, Гродзенскае, Полацкае княствы. У 1294 годзе змагаўся супроць жмудскіх феада-

лаў, якія схіляліся да саюзу з нямецкімі рыцарамі. Пры гэтым князі літоўскае і беларускае войска адбіла напады крыжакоў на Жэмайцію і беларускія землі. Берагі Нёмана сталі месцам зацятых бітваў войска Вялікага княства Літоўскага з Тэўтонскім ордэнам, калі ён асталяваўся паміж вусцямі рэк Віслы і Нёмана.

У бітвах з нямецкімі рыцарамі, якія ўварваліся на Панямонне, асабліва вызначаліся беларускія атрады на чале з Давыдам Гарадзенскім. Працытуем, што аб гэтым напісана ў "Гісторыі Літоўскай ССР" (1978 г.): "У 1284 г. крыжаносцы пад кіраўніцтвам магістра Конрада Шырберга напалі на Гродна і абрабавалі горад. У 1295—1296 гг. яны зноў спустошылі Гродзенскую зямлю. Ваенныя набегі сталі больш частымі, рыцары даходзілі да Навагародка. У 1314 г. яны аблажылі замак і горад, але былі разбіты аб'яднаным войскам гараджан і літоўцаў. Узначаліў гэтае войска гродзенскі стараста Давыд. У 1323 г. пад яго кіраўніцтвам аб'яднаныя дружыны аказвалі дапамогу Пскову і на рацэ Нарве нанеслі паражэнне нямецкім і дацкім рыцарам". Вось яно, братэрства па зброі паміж літоўцамі, беларусамі, рускімі ў сумеснай барацьбе супроць "націску на ўсход". Сягае баявое братэрства ў старажытныя часы. Гэту памяць нам трэба берагчы і ёй ганарыцца.

На рубяжы XIII—XIV стагоддзяў за няпоўную чвэрць стагоддзя Вялікаму княству прыйшлося адбіваць звыш 30 нападаў тэўтонаў і прымаць удзел яшчэ ў 14 паходах супроць іх. У святле такіх фактаў становіцца зразумелай сімволіка "Пагоні" і яе папулярнасць у сярэдневяковай літоўска-славянскай дзяржаве.

Барацьба з нямецкай феадальнай агрэсіяй была першачарговай справай Вялікага княства Літоўскага ў XIV — пачатку XV ст., калі тэўтоны ўзмацнілі свае грабежніцкія паходы.

Толькі за кароткі перыяд з 1345 па 1392 гады крыжакі зрабілі 96 нападаў на Літву і Беларусь. Адбылася буйная бітва на рацэ Стрэве ў 1348 годзе. Крыжаносцы вымушаны былі пакінуць межы Літвы. Шмат разоў рабілі яны беспаспяховыя спробы захапіць Полацк.

"Пагоня" сустракаецца на пячатках Гедыміна і Альгерда, якім давялося ваяваць з Тэўтонскім ордэнам. Спачатку яна была асабістай эмблемай князя і толькі з цягам часу стала гербам роду, дынастыі, зямлі, дзяржавы.

"Пагоня" была гербам вялікага князя Вітаўта. Толькі на шчыце конніка быў намаляваны не падвоены крыж, а тры слупы (калюмны). Другі варыянт герба Вітаўта — князь на троне з мячом у правай і шчытом з "Пагоняй" у левай руцэ.

За дзяржаўны герб Вялікага княства Літоўскага "Паго-

ня" была прынята ў 1384 годзе. Калі Ягайла стаў польскім каралём, ён аб'яднаў у адным гербе "Пагоню" і польскі герб "Арла", але нярэдка ўжываў іх паасобку, гэтак жа, як і ягоны сын Казімір.

Пад сцягамі-харугвамі з адлюстраваннем "Пагоні" ішлі ў бой на Грунвальдскім полі 30 з усіх 40 баявых атрадаў, якія выставіла Вялікае княства Літоўскае пад камандаваннем Вітаўта супроць тэўтонаў у 1410 годзе. Дзесяць палкоў мелі на сцягах выяву слупоў Гедымінавічаў ("калюмнаў").

Па няпоўных даных пісьмовых крыніц, з беларускіх земляў у складзе войска Вітаўта былі атрады з Полацка, Віцебска, Гродна, Бярэсця (Брэста), Пінска, Навагародка, Ліды, Ваўкавыска, Мсціслава, Драгічына, Мельніка. На самай жа справе беларускіх атрадаў было намнога больш. Менавіта ім належала большасць харугваў з выявай "Пагоні".

Беларускія атрады разам з польскімі, літоўскімі, рускімі, украінскімі і іншымі мужна змагаліся ў Грунвальскай бітве. Беларускія і літоўскія воіны першымі прынялі страшэнны ўдар тэўтонаў, панеслі велізарныя страты. У крытычны момант бою асабліва вызначыліся тры смаленскія атрады, у склад якіх уваходзіў атрад з Мсціслава. Усе атрады ўзначальваў сын мсціслаўскага князя Сымона-Лугвеня Юры. Крыжаносцы былі ўшчэнт разбіты. Пасля гэтага на працягу пяці стагоддзяў (да 1914 года) на беларускую зямлю больш не ступала нага ўзброенага немца.

Паводле паведамленняў аўтараў XVI стагоддзя, адлюстраваннне "Пагоні" было на ваенных харугвах гарадоў: Мінска, Навагрудка, Мсціслава, Віцебска, Вільні, Трокаў, Драгічына (Надбужскага), а таксама ваяводстваў: Берасцейскага, Віцебскага, Мсціслаўскага, Мінскага, Віленскага, Навагрудскага, Полацкага і Рэчыцкага павета.

"Пагоню" можна бачыць на гербах Магілёва, Віцебска, Гарадка, Дрысы, Лепеля, Полацка, Рэчыцы, Суража, Чэрыкава, якія, з улікам старажытных традыцый,*** былі зацверджаны ў канцы XVIII—XIX стагоддзяў царскім урадам. "Пагоня" — адна з асноўных эмблем усёй геральдыкі гарадоў Беларусі. Яна ўжывалася на гербах буйных феадалаў. Выдатны рускі гісторык В.Н.Тацішчаў у сваёй "Гісторыі Расійскай" так і занатаваў: "Гербам Белай Русі здаўна быў коннік белы ў чырвоным полі, які трымаў

**** Зацвярджэнне ў канцы XVIII ст. Пагоні ў якасці гарадскога сімвала для беларускіх гарадоў, не было актам, які ўлічваў старажытную традыцыю. Наадварот, царскі урад свядома імкнучыся прынізіць Пагоню, як агульнадзяржаўны і агульнанацыянальны сімвал, пачаў яго надаваць гарадам. Другой мэтай гэтага акта было імкненне выкрэсліць з народнай памяці як старажытныя (магдэбурскія) гербы, так і дэмакратычныя традыцыі і ідэі самакіравання. — А.Ц.*

шаблю (меч) перад сабой".

Некаторыя пытанні геральдыкі Беларусі асвятляюцца ў змястоўнай брашуры А.Цітова "Гербы беларускіх гарадоў". Выйшла яна ў свет у 1983 г., тыражом усяго 1000 экземпляраў. У гандлёвую сетку наогул не паступіла. Значная частка тыражу "захоўвалася" на ўсялякі выпадак у падвале, дзе згніла, а потым была выкінута на сметнік. Брашура, выдадзеная ўпершыню ў Беларусі, трапіла ў рукі вельмі нямногіх чытачоў.

Гісторыя герба "Пагоня" — гэта наша спадчына, гераічная і драматычная. Яе мы павінны ведаць і ёй ганарыцца.

Калі гэты матэрыял быў здадзены ў рэдакцыю "ЛіМа", з'явіўся артыкул "Эвалюцыя палітычнага невуцтва" у газеце "Вячэрні Мінск" за 21 кастрычніка, праз дзень — у "Советской Белоруссии" пад рубрыкай "Пункт гледжання", а таксама ў іншых выданнях. У ім група аўтараў закранае пытанне пра герб "Пагоня" і нацыянальны сцяг, якія зноў аб'уляюцца "нацыяналістычнымі". Аднак новых аргументаў у параўнанні з вышэйразгледжанымі выступленнямі У.Гойтана і У.Бегуна не прыводзіцца і зусім адсутнічае гістарычны экскурс у мінулае, адкуль бяруць пачатак сімвалы, характэрныя як для Літвы, так і Беларусі, які ў дадзеным выпадку зусім неабходны.

**Літаратура і мастацтва,**
**1988 г., 11 лістапада.**

*Анатоль ЦІТОЎ*

# У цені двухгаловага арла

Гісторыя герба "Пагоня", асабліва час яго ўзнікнення, так ці іначай разглядалася ў розных даследваннях. Але мы ведаем мала або не ведаем зусім, які ўплыў на нацыянальную свядомасць рабіў герб "Пагоня" пазней, у XVIII і XIX ст., знаходзячыся ў цені двухгаловага расійскага арла.

Калі, пасля далучэння ўсходняй частцы Беларусі да Расійскай імперыі (1772 г.), царскі ўрад стварыў Палявы гусарскі беларускі полк, у 1775 г. ён быў укамплектаваны "да поўных шасці эскадронных штатаў нацыянальнымі людзьмі зноў далучанай да Расіі па першаму падзелу Польшчы—Беларускай губерні". У наступным годзе полк атрымаў уласны штандар з гербам, на якім шчыт падзелены на два полі: у чорна-залатым — выява чорнага двухгаловага арла, у дольнай чырвонай частцы — выява літоўскага ўзброенага ездака на белым кані, з узнятай шабляй". Колер самога штандара быў белы. Беларускія гусары насілі чорныя дуламы (кароткія курткі са стаячым каўняром) і чорныя чакіры (вузкія гусарскія штаны) аздобленыя жоўтымі матузкамі і сярэбранымі гузікамі.Ківер бы ўпрыгожаны белым шарсцяным бантам, які прымацоўваўся стужкай. Колер стужкі невядомы, у апісанні формы яна не агаворана, а літаграфія сярэдзіны мінулага стагоддзя, што захавалася да нашага часу, на жаль, чорна-белая. Але, як нам здаецца, стужка мусіла быць чырвонай, таму што, адпаведна з правіламі геральдыкі, менавіта на гэтыя колеры раскладаецца герб "Пагоня", які быў за штандары Палявога гусарскага беларускага палка. Акрамя палкавых, існавалі ротныя сцягі — першыя, як правіла, белыя, другія паласатыя, пры

гэтым колькасць палос вызначалася па жаданню камандзіраў. На палкавых штандарах дамінаваў дзяржаўны герб на ротных — палкавы.

На жаль, да нашых дзён палкавыя сцягі не захаваліся, як і сцяг беларускіх гусараў XVIII ст., полк якіх праіснаваў з 1776 да 1783 г.г., калі яго перайменавалі ў Варонежскі.

Прыкладна ў той жа час (70-я гады XVIII ст.) быў створаны і Полацкі мушкецёрскі полк. Герб яго баявога сцяга — у правым, залатым, полі шчыта — палова чорнага расійскага арла, у левым, чырвоным, зноў — Пагоня. У 1790 г. войска пад кіраўніцтвам А.Суворава авалодала апорай Асманскай імперыі — крэпасць Ізмаіл. Галоўная роля ў гэтай перамозе належала менавіта полацкім мушкецёрам, якія першымі ўварваліся ў крэпасць. Полацкія палкі ўпамінаюцца нават у паэме Д.Г.Байрана "Дон Жуан".

Выява Пагоні была не толькі на баявых сцягах XVIII ст., яна жыла і ў наступным, XIX ст. Сведчанне таму — штандары лейб-гвардыі Гродзенсага гусарскага палка. Гэтая вайсковая часць пачала фарміравацца ў 1824 г. з ураджэнцаў "літоўскіх" губерняў (нагадаем чытачу, што літоўскімі губернямі ў той час лічыліся Мінская, Гродзенская і Віленская, а беларускімі — Віцебская, Магілёўская і Смаленская), а таксама з часткі Клясціцкага палка, як да 1824 г. насіў назву Гродзенскага. Ужо ў 1807 г. полк наводзіў жах на напалеонаўскіх салдат, якія клікалі гродзенцаў "сінімі гусарамі" — па колеру іхняй формы. Асабліва праславіўся полк у Айчынную вайну 1812 г. Менавіта яму належыць слава першых перамог над французскімі войскамі ў бітве пад Клясціцамі, дзе быў смяротна паранены адзін з самых папулярных герояў Айчыннай вайны ўраджэнец Віцебшчыны генерал Я.П. Кульнёў. Напалеон, даведаўшыся пра смерць Кульнёва, паслаў у Парыж вестку аб тым, што "генерал Кульнёў, адзін з лепшых афіцэраў, рускай лёгкай кавалерыі, забіты пад Дарысай".

Гэты полк удзельнічаў у "бітве народаў" пад Лейпцыгам у кастрычніку 1813 г. Гродзенскі ж гусарскі полк першым з рускай арміі прайшоў праз "сталіцу свету", як тады звалі Парыж, а лейб-гвардыі Гродзенскі гусарскі полк таксама першым увайшоў у вызваленую ім у час руска-турэцкай вайны 1877—1878 гг. Сафію. На малінавых з белым гусарскіх ківерах воінаў была выява двухгаловага арла, на грудзях якога — як прыналежнасць і напамінак аб паходжанні — Пагоня. Дарэчы, з 16 гусарскіх палкоў Расіі толькі два насілі назву лейб-гвардзейскіх — полк "Яго Вялікасці" і Гродзенскі.

У розныя гады пад штандарамі гродзенскіх гусараў і

лейб-гусараў служылі Я.Кульнёў, паэт-гусар, партызан Д.Давыдаў, дзекабрыст М.Лунін, які памёр на царскай катарзе. М.Лермантаў і інш.

Але былі і ганебныя старонкі ў гісторыі гэтых палкоў — удзел у падаўленні паўстання 1831 і 1863 гг.

Герб "Пагоня" існаваў не толькі на штандарах вайсковых часцей, што фарміраваліся з ураджэнцаў Беларусі. У канцы 50-х гадоў мінулага стагоддзя быў распрацаваны вялікі герб Расійскай імперыі, дзе на крылах царскага арла былі размешчаны аб'яднаныя шчыты розных зямель. Сярод іх — шчыт аб'яднаных гербаў княстваў беларускіх, на якім былі прадстаўлены тры гербы — полацкі, віцебскі і мсціслаўскі. (Праўда, варта адзначыць, што апошні можна поўнасцю аднесці да пазнейшых тварэнняў дэпартамента герольдыі). На полацкім і віцебскім — выявы традыцыйнага герба былых княстваў — Пагоні, адпаведна ў сярэбраным і чырвоным палях.

Шчыт аб'яднаных гербаў княстваў і абласцей Паўночна-Заходняй Расіі таксама ўключыў гербы Вялікага княства Літоўскага, Самагіціі (Жмудзі) і Беластоцкай вобласці. У правым, чырвоным, полі, як на папярэднім шчыце, выява Пагоні, у ніжнім, рассечаным — у верхняй частцы сярэбраны аднагаловы (польскі) арол, у ніжняй зноўтакі Пагоня (як вядома, Падляшша-Беласточчына была анексіравана Каронай Польскай перад заключэннем Люблінскай уніі ў 1569 г.) і нарэшце ў левым полі — герб Самагіціі з выявай чорнага мядзведзя.

Яшчэ ў сваёй бессмяротнай паэме "Пан Тадэвуш" (дзея ў якой разгортваецца ў першыя дзесяцігоддзі XIX ст. на Навагрудчыне — "Літве"). Адам Міцкевіч, гаворачы аб будучай вайне Напалеона з Расіяй, пісаў: "...Няхай заіржыць тут пагоня, на Жмудзі вядзмедзь хай раўне!" Нам здаецца, што ў гэтых радках М.Міцкевіч апіраўся і на яшчэ жывую тады геральдычную традцыю, і на гістарычную памяць сваіх сучаснікаў і землякоў. Усё гэта вельмі добра сведчыць аб тым, што асноўным у гербе Жмудзі была выява чорнага мядзведзя, а не Пагоні.

У паўстанні 1863 г. герб "Пагоня" у спалучэнні з "арлом белым" стаў сімвалам барацьбы. Царскі сатрап Мураўёў-вешальнік забараніў насіць жалобныя і рэвалюцыйныя знакі — чорныя шапкі з белымі султанамі, спражкі з аб'яднаным гербам Польшчы і Літвы.

Такім чынам, герб "Пагоня" у XIX ст. стаў, з аднаго боку, сімвалам афіцыйнай тэндэнцыі, а з другога — рэвалюцыйна-дэмакратычнай. Але ва ўсіх выпадках ён атаясамліваўся з канкрэтнай тэрыторыяй — сучаснай Беларуссю, хаця часта называўся літоўскім. У XIX ст. беларускімі губернямі лічыліся тыя, якія адышлі да Расіі ў часе першага падзелу ці раней, — гэта

Віцебская, Магілёўская і Смаленская, а "літоўскімі" — Мінская. Гродзенская і Віленская, пазней жа - толькі дзве апошнія. Гэта знайшло сваё адлюстраванне і ў губернскіх гербах — калі ў першым гербе Гродзенскай губерні была выява Пагоні ў горнай частцы шчыта, а ў дольнай — і зубра, то пры наступным "рэдагаванні" (у 1845 г.) быў пакінуты толькі зубр. Гербамі з Пагоняй карысталіся таксама Віленская і Віцебская губерні. З 1845 г. пачынаецца да волі шырокае ўвядзенне павятовых гербаў. У горнай частцы гербаў Ашмянскага, Вілейскага, Дзісненскага, Лідскага павета Віленскай губерні заставалася Пагоня. З астатніх павятовых гербаў яна знікла, але заставалася на тых гербах. Які былі нададзены беларускім гарадам пераважна ў канцы XVIII ст. Хоць гербы часта насілі штучны характар і былі ўніфікаваны паводле агульнага ўзору, у адрозненне ад магдэнбургскіх яны адлюстроўвалі праз сімволіку герба старажытны зямельны сімвал, а не гарадскія асаблівасці.

Гэтая тэндэнцыя найбольш яскрава адбілася на герабх Віцебскай і Магілёўскай губерняў, колішняй радзіме Пагоні. Усяго царскім урадам было нададзена 9 гарадскіх гербаў з яе выявай.

Адлюстраванне старажытнай Пагоні на беларускіх губернскіх, павятовых, гарадскіх, вайсковых гербах было з'явай, якая канстатавала асэнсаванне суседнімі народамі тоеснасці геаграфічна-этнічнай Беларусі і яе герба "Пагоня".

**Спадчына,**
**1983, № 2.**

*Уладзімір КАЗБЯРУК*

# Аб сімвалах і колерах

Сярод навукоўцаў і чыноўнікаў сёння нямала людзей, якія чамусьці баяцца нацыянальнай гісторыі і ўсімі сіламі намагаюцца адгарадзіць ад яе ўсіх нас. З нейкай асаблівай заўзятасцю яны накідваюцца на гістарычную сімволіку, на герб "Пагоня" і бела-чырвона-белы сцяг. Пры гэтым дзесяткі, калі не сотні разоў паўтараецца адзін і той жа аргумент: у час Вялікай Айчыннай вайны гэтымі сімваламі карысталіся паслугачы фашыстаў. Быццам яны ўсё гэта і прыдумалі.

А колькі было тых паслугачоў, які па сваіх ідэйных перакананнях служылі фашыстам і для якіх тыя сімвалы маглі мець нейкае значэнне? Я не ўпэўнены, што набралася б некалькі дзесяткаў.

Вядома, быў "батальён" была "самаахова", былі паліцаі. Але ў кожным народзе знойдуцца людзі, гатовыя на любую брудную работу. Для іх ніякія сімвалы не маюць значэння.

Практычна гербам "Пагоня" і бела-чырвона-белым сцягам карысталіся чужынцы, тыя ж самыя, што гаспадарылі ў Доме ўрада ў Мінску, ва ўсіх школах, бальніцах, на вакзалах. Дык што з гэтымі ўсімі будынкамі рабіць, калі іх фашысты апаганілі? Можа, таксама разбурыць? Зрабіць тое ж, што і з мінскай Нямігай, што рабілася з рознымі цэрквамі, касцёламі і іншымі помнікамі архітэктуры?

Ёсць яшчэ і больш сур'ёзнае пытанне. Пад ідэйным прыкрыццём якіх сімвалаў знішчаліся людзі — мільёны савецкіх людзей, беспартыйных і камуністаў, рэвалюцыянераў з ленінскай гвардыі і самых сціплых працаўнікоў — у Курапатах, на Салаўках, па ўсёй

велізарнай краіне? І ці вінаваты гэтыя сімвалы, што з імі нехта так абыходзіўся?

У намаганнях бэсціць "Пагоню" — прытым без усякай меры — расправіцца з гістарычнай, а заадно і з нацыянальнай свядомасцю народа, знішчыць яе разам з мовай. У гэтым уся бяда. А тое, што ў беларускага, літоўскага, польскага народаў быў нейкі Грунвальд і што там "Пагоня" натхняла нашых продкаў — прафесійных фальсіфікатараў гісторыі зусім не цікавіць.

А што сказаць можна пра сцяг? Спалучэнне бела-чырвона-белага колеру не мае за сабой такой багатай гісторыі, таксама, як і зялёнага з чырвоным. Але пры гаворцы аб гэтых сцягах не ўлічваецца адна акалічнасць. Чырвоны — гэта не толькі колер пралетарскага сцяга, сімвал сацыялістычнага руху, але і колер сцягоў, пад якімі воіны-беларусы і літоўцы змагаліся супраць крыжакоў, у тым ліку і пад Грунвальдам. "Пагоня" красавалася на чырвоным фоне сцяга. Так што чырвоны колер мае свае глыбокія гістарычныя карані.

А белы? Чамусьці мы забываем, што Русь у нас, як сказаў Францішак Багушэвіч, — "не вялікая, не малая, не чырвоная, не чорная яна была, а белая, чыстая: нікога не біла, не падбівала, толькі баранілася". Дык чаму ж гэты белы колер — колер першароднай чысціні, што так надзейна захаваўся ў наша назве, у найменні ўсяго народа, не павінен захавацца і ў сцягу?

Спалучэнне белага і чырвонага ёсць у нашых суседзяў — палякаў. Паўтараць польскі сцяг у нас няма падставы. А гэта значыць, што патрэбна нейкае іншае спалучэнне, але іменна белага і чырвонага колераў. Гэтага патрабуе і гісторыя, гэта апраўдваецца і сучасным станам. Між тым супраць спалучэння бела-чырвона-белага колераў пакуль што ніхто не выказаў хоць колькі-небудзь пераканаўчых довадаў.

**Літаратура і мастацтва,**
**1989 г., 12 мая.**

*Віталь КОШАЛЕЎ*

# Колеры "Пагоні"

Прачытаў у "ЛіМе" (нумар ад 12.05) ліст Уладзіміра Казберука, прысвечаны нашай нацыянальнай сімволіцы. Хоць мая прафесія ніяк не стасуецца з гэтай тэмай (я—урач-тэрапеўт), але яшчэ са школьных часоў я вельмі цікаўлюся геральдыкай. Хачу падзяліцца некаторымі сваімі меркаваннямі, бо не магу не заўважыць, што аднаго толькі эмацыянальна-узнёслага стасунку да гістарычных сімвалаў роднага краю недастаткова, каб давесці слушнасць свайго пункту гледжання. Трэба мець больш дакладныя ўяўленні аб агульных прынцыпах фарміравання геральдычных знакаў. Калі з "Пагоняю" усё здаецца зразумелым, дык адносна колеру сцяга аўтар допісу вельмі памыляецца, калі лічыць, што яны могуць быць выбраны адвольна. Хачу звярнуць увагу на тую важную акалічнасць, што самастойнае значэнне колеры сцяга маюць толькі па-за межамі класічнай геральдыкі (так званы варварскі геральдычны стыль).

Даўней сцягі (штандары, харугвы, буньчукі, прапорцы, значкі; памятаеце — "уланы з пестрымі значкамі..."?) спаўнялі не толькі і не столькі рэпрэзантацыйныя функцыі, а з'яўляліся найперш неабходнымі элементамі кіравання вайсковымі дзеяннямі ў тыя далёкія часы, калі адсутнічала тэлефонная і радыёсувязь. Нездарма і воінскія званні звязаны з гэтымі знакамі — харунжы, прапаршчык, буньчучны атаман і інш. Нацыянальных і дзяржаўных сцягаў (ў сучасным сэнсе) на тыя далёкія часы проста не існавала. Можа, менавіта таму, як піша У.Казбярук, "Спалучэнне бела-чырвона-белага колераў не мае за сабой такой багатай гісторыі", як "Пагоня"? Так і не.

Сапраўды, харугваў такога выгляду ў аналагах нашай гісторыі пакуль што не адкрыта. Бо на харугвах (знаках ваяводстваў, паветаў, асобных магнатаў) альбо выявы гер-

баў, альбо вобраз святога патрона. Напрыклад, арханёл Міхаіл патранаваў войскі Рускага (Кіеўскага) ваяводства, войскі запарожскіх казакаў.

Іншая рэч — сцягі менш значных вайсковых адзінак: рэгімэнтаў, швадронаў і г.д. Такі сцяг меў даносіць да кожнага ўдзельніка баталіі тую ж інфармацыю, як і баявыя харугвы, але ў спрошчаным, без залішняй дэталізацыі выглядзе. Інакш кажучы, класічная геральдыка вымагала і вымагае сціслых суадносін паміж выяваю герба і колерамі сцяга. Прыклады? Калі ласка. Цытую радкі з допісу У.Казберука: "Паўтараць польскі сцяг у няс няма падставы". Безумоўна. Тым, болей, што колеры польскага сцяга азначаюць: белы арол у чырвоным полі; таксама, як, напрыклад, колеры дзяржаўнага сцяга ФРГ (чорны, чырвоны, жоўты) — гэта чорны арол з чырвонымі кіпцюрамі на жоўтым фоне. Толькі гэта і нічога іншага.

Ну, дык якія колеры павінен уключаць сцяг, што атаясамлівае "Пагоню"? Бо герб гэты геральдычна дэшыфруецца, як "срэбны рыцар з чырвонаю тарчаю (шчытом) на белым кані". Адсюль: бела-чырвона-белы, бо срэбра геральдычна адпавядае беламу колеру.

Вось гэтай, зразумелай для іншых продкаў і забытай намі логікай карысталіся стваральнікі нацыянальнага сцяга беларусаў. Калі гэта адбылося? Даўно. Ніяк не ў XX стагоддзі. Сцяг існуе столькі, колькі існуе "Пагоня". Ускосным падцвярджэннем можа лічыцца штандар рэгіменту ўланаў Вялікага княства Літоўскага, які і зараз можна ўбачыць у вітрынах Віленскага гістарычнага музея. Праўда, ён мае чатыры, паясы: белы, чырвоны, белы, чырвоны, што ізноў жа дэшыфруецца як срэбны рыцар з чырвонай тарчай на белым кані ў чырвоным полі.

І хай не абураюць гэтыя колеры "пурытан" ад аднакаляровай "класавай" геральдыкі. Хай лепш не пашкадуюць гадзіну-другую свайго часу, каб адшукваць у гістарычных крыніцах тлумачэнне для колераў паважанай усімі чорна-залатой гвардзейскай стужкі. Я ўпэўнены, што яны з цікавасцю адкрываюць для сябе, што гэтае спалучэнне колераў, запазычанае са стужкі георгіеўскага крыжа, тлумачыцца вельмі проста: чорны двухгаловы арол Расійскай імперыі ў залатым полі. А андрэеўскі сцяг? Касы крыж — знак святога патрона Расіі Андрэя Першазванага. Вось і аказваецца, што ў такой старажытнай навуцы, як геральдыка, нічога выдумваць не трэба. Трэба проста трохі ведаць яе законы. Тады нават у рамках разгорнутых апошнім часам спрэчак будзе менш эмоцый, менш доказаў тыпу "бо так прыгажэй", менш непатрэбнай палітызацыі.

І яшчэ... Мне здаецца, што той палемічны імпэт, які

набрала дыскусія аб сімволіцы, пэўным чынам звязаны з адначасовым парадаксальным атаясамліваннем і супрацьпастаўленнем сімволікі дзяржаўнай і нацыянальнай. І зноў, прычнына — неразуменне і ігнараванне фундаментальных прынцыпаў не толькі геральдыкі, але ўжо і логікі. Чаму? Справа ў тым, што большасць краін маюць ідэнтычныя нацыянальныя і дзяржаўныя сімвалы. Большасць, але не ўсе. Напрыклад, нацыянальны сцяг ірландцаў — залатая арфа ў зялёным полі (ім карыстаюцца ірландцы ўсяго свету), а дзяржаўны сцяг Ірландскай рэспублікі — зялёна-белааранжавае палотнішча. Такіх прыкладаў шмат. Зліццё нацыянальнай сімволікі з дзяржаўнай адбываецца тады, калі дзяржава будуецца на агульнанацыянальным падмурку. Гістарычным лёсам нашай сучаснай дзяржаўнасці было наканавана будаўніцтва яе на класавых падвалінах. Адбітках гэтага факту і з'яўляецца адсутнасць пераймальнасці ў гістарычнай і сучаснай геральдыцы, разыходжанне паміж дзяржаўнымі і нацыянальнымі сімваламі. Гэта — адлюстраванне аб'ектыўных працэсаў. Гэта — знакі часу.

Маю надзею, што разуменне гістарычнай логікі трохі знізіць звышвысокі, як мне падаецца, эмацыянальны напал палемікі ў адносінах да даволі простага, але вельмі цікавага пытання.

**Літаратура і мастацтва,**
**11 жніўня 1989 г.**

*П.ТЮРИН, М.ТЮРИН**

# “Nach Wendischen Siten”

## (Из истории красно-бело-красной символики)

Изучать происхождение флагов государства — занятие на редкость увлекательное и поучительное поскольку в определенные периоды история флага вырастала до значений утверждения символа веры. Какой флаг признаешь над собой, какому флагу веришь и молишься, чему отдаешь почести, с чем связываешь свое прошлое и свое будущее — это те вопросы, которые неизменно встают, когда пытаются заново определить пути национального развития. Зачастую интерес к своему флагу приобретал чуть ли не маниакальные формы потребности выяснить, в полной или мере в достойных ли символах гордость за свой народ, его полноценность основных знаках национального суверенитета. Поэтому утверждению государственной геральдики, как правило, предшествует этап тщательных исследований ее онтологии, и потому же так часто происхождение многих флагов окружено легендарными, почти мистическими событиями в истории народа.

Официальная символика всех государств стремится к “патентной чистоте” — следованию формуле независимое государство — независимый флаг. Но особенно существенно соблюдение этого принципа для народов, лишь впервые в своей истории заявляющих о своей национальной самостоятельности, потому что именно степень “патентной чистоты” государственных символов отражает и декларирует уровень самостоятельности и независимости самого государства.

В той или иной мере различные закономерности про-

* *На жаль, ініцыялы аўтара, па незалежных ад складальніка прычынах, разшыфраваць не падалося магчымым. — А. Ц.*

цесса формирования государственной символики коснулись и истории красно-бело-красного флага, бывшего в течение 17 лет (1923—1940 гг.) государственным флагом Латвии.

Впервые о красно-бело-красном флаге в связи с лэттами (латгалами) упоминается в написанной на немецком языке Рифмованной хронике. В новое время (около 1870 г.) начало мнению, что красно-бело-красный флаг есть действительно латышский флаг, положили, со ссылкой на Рифмованную хронику, несколько студентов, входивших в Тербатское братство младолатышей.

Надо подчеркнуть, что в Рифмованной хронике, содержащей 12.016 строк, утверждению о том, что "красный флаг с белой полосой" — уделена фактически лишь одна строка и больше нигде в тексте об этом не говорится, а весь фрагмент, относящийся к этому месту, занимает 15 строк. Кроме того, достаточно вольные переводы с немецкого оригинала во многом маскируют историческую предметность Рифмованной хроники. Именно на эту часть хроники — фактически единственный аргумент (строки 9.215—9.229) — легла основная тяжесть в попытках убедить, что красно-бело-красный флаг — латышский. Для того, чтобы разобраться, что же побудило автора хроники, члена Ливонского (Тевтонского) ордена, к заявлению, что увиденный им осенью 1279 года флаг отряда Лантвера, ведомый "братом-рыцарем" из резиденции Ливонского ордена, — это "флаг лэттов", необходимо рассмотрение данного фрагмента хроники в более широком историческом контексте, чем тот, который содержится в ней самой.

Как отвечает комментатор Рифмованной хроники, изданной в 1936 году, Р.Клаустыньш, она значительно уступает в объективности Ливонской хронике Генриха Латвийского. Автор Рифмованной хроники зачастую не особенно хорошо различает не только отдельных лиц или противоборствующие силы (в частности епископство и Орден), но и народы — немцев, шведов, датчан, русских, с одной стороны, и племенную специфику местного населения, с другой.

Известно, что римский (рижский?) епископ для выполнения папской миссии и германизации восточной Прибалтики вынужден был основать Орден рыцарей-меченосцев, за пополнением которого он ежегодно отправлялся в Германию. Меченосцы, отличительным знаком которых были красный крест и меч на белом фоне, вербовались на год, в основном из числа "грешников", которым за их "рыцарство" было обещано отпущение грехов, а также из числа разорившихся и неимущих в Германии.

Уже вскоре после основания своего ордена в 1202 году "пилигримы" представляют самостоятельную силу, они практически выходят из-под контроля епископа, начинают конкурировать и даже враждовать с ним. Еще через несколько лет (1207 г.) они требуют от Альберта фор-

мального закрепления за ними доли завоеванного: происходит раздел Ливонии на три части. В соответствии с буллой папы Иннокентия III от 1210 г. магистру меченосцев Фолквину раздел Ливонии не только утверждался высшей инстанцией, но и предоставлял рыцарям право завоевывать новые земли без всяких по ним обязательств в отношении к епископу. Образовав государство в государстве, рыцари получили в свое прямое подчинение значительную территорию, и прежде всего ту, на которой находился Цесис (Wenden) — "город меченосцев". Разгромленный в 1236 году под Сауле объединенными силами земгалов и литовцев, этот орден вливается в Тевтонский орден в 1237 г. После своего поражения Орден меченосцев перестает существовать только номинально, он получает название Ливонского ордена.

В оригинале Рифмованной хроники сообщается, что флаг, который нес отряд лантвера из Вендена, был красный с белой полосой — по вендскому обычаю (nach wendischen siten). Поясняется, что Венден — замок, откуда и известен этот флаг, располагается на земле лэттов. Далее автор утверждает, что описанный им флаг — это действительно флаг лэттов.

Нет ничего удивительного в том, что когда в переводах на латышский язык "Wenden" заменяется на "Цесис", а "wendischen siten" — на "цесисский обычай" или "обычай цесисцев", то у большинства ее читателей никаких проблем относительно того "что есть что" и "кто есть кто" не возникает.

Каменный замок меченосцев Венден был построен в 1207г. неподалеку от уже имевшегося там (старого деревянного) замка вендов около озера Арайши — на территории, где жили венды**, и от имени которых новый замок получил свое название. О вендах многократно говорит Генрих Латвийский, отличая их от других племен, живущих рядом с ними, — ливов и лэттов. По мнению Г.Вирхуфа (один из священников Цесиа), автор Рифмованной хроники просто перепутал вендов с латышами.

Имеются историко-этнографические исследования, указывающие на распространенность в XIII веке местностей в Курляндии, где жили венды и где сохранились их названия. Много вендов жило около Дорпата (Тарту): расселялись у Новгорода, на реке Волхов и далее. В тексте Ливонской хроники также говорится о многочисленности вендов и рассказывается, что "венды в то время были бедны и жалки; прогнанные с Винды, реки в Куронии, они жили сначала на Древней Горе, у которой ныне построен город Рига, но откуда были опять изгнаны курами, многие были убиты, а остальные бежали к лэттам,

---

*** Венеды, венеты, венды, вiнды — самая старажытная, зафiксаваная ў пiсьмовых крынiцах назва славянаў. Гл.: Гiст. Энцыклапедыя Беларусi, т.2. — А.Ц.*

жили там вместе с ними и очень обрадовались приходу священника". Нигде в тексте Ливонской хроники не говорится о том, что венды враждовали с немцами, но что "братья-рыцари со своими вендами" воевали с язычниками, что "венды в то время были с немцами, многие из вендов составили что-то вроде наемного войска у меченосцев, в 1225 году папский легат в Ливонии внушал братьям-рыцарям налагать на вендов "лишь легкое бремя".

О распространенности вендов на южном побережье Балтийского моря и вообще в прибалтийском регионе говорит, в частности, тот факт, что еще Птолемей называл Балтийское море Венетским заливом.

Венды — это древний энтоним с основой ven(e)d применялся к славянам как к этническому целому, и это название было дано им извне и применялось только соседями-неславянами. Сравни: нем. Wenden, Winden, windisch, wendisch, эст. wene — "русские", финск. venala — "русский язык", venalainen — "русский", vena — "Русь", vanaks — "по-русски". Это же название у целого ряда древних авторов в формах Venedi, Venadi, Veneti встречается в контекстах, предполагающих нахождение соответствующего этноса в тех местах, где позже отмечены славяне.

В XI—XII вв. существовала на огромной территории между устьями рек Лабы (Эльбы) и Одры (Одера) на севере и до Дуная и Днестра на юге Вендская держава, состовшая из племенных княжеств вендов. Некоторые славянские племена совместно с польскими князьями боролись с немцами; позднее вендские княжества существовали часто как вассалы саксонских князей.

Расселяясь на восток, венды несли туда свои верования, обычаи, образ жизни. Одним из главных их божеств был Перун. Они строили храмы и драпировали их отделкой красного цвета, в них хранились священные знамена, которые особо почитались и к которым были приставлены специальные жрецы. Знамена выносились в праздники и во время военных походов, первосвященник вендов носил белое, вышитое золотом одеяние, поверх которого была красная повязка, выходя в море, венды вели свои корабли под красно-белыми флагами.

Здесь нужно заметить, что Э.Мугуревич и Я.Апалс считают: венды, которых описал Генрих Латвийский, не имеют отношения к вендам в общеупотребимом их понимании. Эти авторы утверждают, что материальная культура вендов, живших на территории Риекстказиса в Цесисе, имеет общие черты с культурой курземских ливов, и на этой основе относят их к группе таких ливов.

Историко-этнографические исследования показывают, что когда сравнительно немногочисленные завоеватели захватывают новую территорию, они для укрепления новой религии не отказывают местным жителям в сохранении тех

традиций и обрядов, которые могут быть включены в концепции новой веры. Они приспосабливают местные ритуалы и обычаи к новой культуре, а новая культура, в свою очередь, приспосабливается к местной культуре, испытывая на себе ее влияние.

Так, очевидно, случилось с комбинацией цветов вендов, и потому о флаге в Рифмованной хронике автор говорит, что он имел сочетание цветов по вендскому обычаю.

Е.Дишлер считает, что флаг, описанный в Рифмованной хронике, скорее всего, не был латышским флагом, а флагом живущих в Цесисе вендов. Возможно, что после расформирования Ордена меченосцев и лишения их красных символов на белом фоне, этот флаг и стал флагом замка Венден. Так, например, М.Силиньш в комментариях к изданной в 1893 году Рифмованной хронике пишет, что "указание хроники на вид латышского флага считаю малосущественным. Это был только лишь присвоенный ордену отличительный знак".

Увиденный автором Рифмованной хроники красно-бело-красный флаг мог быть им или перепутан с флагом вендов (как считал упоминаемый выше Г.Вирхуф). Или, возможно, автор ее — рыцарь Ордена, утверждал, что красно-бело-красный флаг есть лэттов, тем самым хотел подчеркнуть, что лэтты теперь уже христиане, подчинены ордену и находятся теперь под флагом "владетелей и сущей рабов земли Пресвятой Девы" из Вендена (как пишет о немцах Генрих Латвийский).

Некоторые авторы считали, что для латышей за редкими исключениями (области Барта, Ница), красный цвет не является типичным. Так, например, М.Силиньш указывает, что в Северной и Западной Видземе доминируют темные краски — зеленые, коричневые, синие.

*<24>. Тюрин П., Тюрин М. "Nach wendischen siten" (из истории красно-бело красной символики). — Советская Латвия, 1991, 3 сент.*

*<25>. Звязда, 1989, 7 июня.*

*<26>. Там же.*

*<27>. Иванов К. Указ сач., с. 32.*

**Неман. 1991 г. № 5.**
**Беларускамоўны варыянт гэтае працы апублікавала "Звязда", 1991, 12 красавіка;**
**а таксама гл. зборнік "З гісторыяй на "Вы". Мн. 1991г.**

*Анатоль* **ЦІТОЎ**

# Якім быць гербу незалежнай Беларусі?

*Пацвярджэнне поўнай незалежнасці нашай рэспублікі і наданне канстытуцыйнай сілы Дэкларацыі аб суверэнітэце вылучыла пытанне аб новым гербе — сімвале незалежнай дзяржавы. За апошнія семдзесят гадоў мы карысталіся навязанымі нам трыма палітычнымі сімваламі (1919, 1927, 1937 гг.). Яны адлюстроўвалі тыя задачы, якія пракламаваліся пануючай ідэалогіяй. Нацыянальна-гістарычная сімволіка знаходзілася або ў заняпадзе, або ўвогуле пад забаронай. Думаецца, чытачы памятаюць тую палеміку, якая адбывалася апошнія два-тры гады, і сумна вядомы Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР 1989 г. аб выкарыстанні сімволікі. Дзеля праўды варта адзначыць, што гэты Указ, насуперак волі яго стваральнікаў, прыцягнуў яшчэ больш прыхільнікаў да старажытных сімвалаў — "Пагоні" і бел-чырвона-белага сцяга.*

Але гэтыя спрэчкі ўжо ў далёкім мінулым. Сёння іншы час, які дыктуе неабходнасць адмаўлення ад голых прапагандысцкіх сімвалаў і вяртання да спрадвечнага, які існаваў у памяці і свядомасці народа ўжо звыш тысячы гадоў — да герба "Пагоня".

Праўда, знойдуцца і зараз скептыкі, якія будуць сцвярджаць, што гэта быццам бы "літоўскі" герб. Давайце разбяромся.

## Сімвалы дзяржаўнасці

Азначэнне "літоўскі герб", або "герб старой Літвы", мякка кажучы, двухсэнсавае: яго можна разумець гістарычна — як герб Вялікага княства Літоўскага (далей

ВкЛ) і асучаснена — як герб Літвы (што часцей за ўсё і робіцца не толькі шырокімі коламі аматараў, але і прафесіяналаў, — як гісторыкаў, так і геральдыстаў), г. зн. без уліку гістарычнага кантэксту ўзнікнення і ўжывання герба "Пагоня". Апошняе з'яўляецца, як нам здаецца, неаб'ектыўным. Мы цалкам перакананыя, што названы герб ні ў якім разе не павінен называцца "літоўскім" у сучасным разуменні гэтага тэрміна. Гэты герб мае чыста славянскае паходжанне, у той жа самай ступені, як і герб Масквы — так званы "Георгій Пераможац". І калі другі мы цалкам адносім да патэнцыялу рускай геральдыкі, то першы цалкам і поўнасцю належыць беларускай нацыянальнай геральдыцы, а не якой-небудзь іншай. На чым гэта сцвярджэнне грунтуецца? Паспрабуем коратка выказаць асноўныя палажэнні сваёй канцэпцыі.

1) Перш за ўсё трэба мець на ўвазе, што ВкЛ — гэта не літоўска-балцкая дзяржава, а дзяржава ў сваёй аснове славянская. Гэты факт быў падкрэслены яшчэ К.Марксам, які гаварыў пра перыяд феадальнай раздробленасці: "Русь у той час была падзеленая на Маскву і Літву". Такім чынам, ва Усходняй Еўропе існавалі два цэнтры, што супернічалі за права аб'яднання ўсходнеславянскіх земляў. На першым этапе гэта болей удавалася ВКЛ. У XIV ст. яго тэрыторыя займала плошчу сучаснай Беларусі, Украіны, Літвы (летапіснай Самагіціі, альбо Жмудзі). Усходнія межы яго праходзілі бліз Мажайска, а заходнія — па рацэ Вісле. Праўда, пазней яго тэрыторыя пачынае даволі хутка змяншацца, а ў другой палове XVI ст. ВкЛ крыху перавышае сучасную тэрыторыю БССР, амаль цалкам супадаючы з арэалам беларускай мовы. Дарэчы, апошняя з'яўляецца дзяржанай мовай ВкЛ амаль да канца XVII ст., пасля чаго яе месца ў афіцыяльных працэдурах заняла польская, а з падзелам Рэчы Паспалітай, — расейская (прычым асабліва інтэнсіўна з 20-30-х г. г. XIX ст.).

У гэтай сувязі вельмі цікавым уяўляецца сведчанне польскага гісторыка другой паловы XVI ст. Мацея Стрыйкоўскага, які пісаў пра славянскія народы: "Русічы ды іншыя рускія народы імя і назву сваю маюць, усе славянскай мовай карыстаюцца і ўсё ёсць хрысціянамі. Адпаведна абраду (веравызнанню. — А.Ц.) ёсць вялікая частка грэцкіх — як Масква, Беларусічы, Балгары, Басьнякі, Літоўцы, Сербы і г. д. Другія ў адпаведнасці з навукай рымскага святога касцёлу — як Палякі, Мазуры, Чэхі, Мараўцы, Харваты, Далматцы... ды іншых шмат народаў карыстаюцца славянскай рускай мовай". Як бачым, тэрмін "літоўцы" у гэтым урыўку ўжываецца для праваслаўнага насельніцтва, у той час як вядома, што

сучасныя літоўцы пераходзілі з паганства ў каталіцызм, мінаючы праваслаўе, і гэты працэс праходзіў крыху пазней. У той жа час, калі праходзілі ўрачыстасці, прысвечаныя 1000-годдзю хрышчэння Русі, святкавалася 600-годдзе хрышчэння Літвы (у сучасным сэнсе слова).

Варта таксама адзначыць, што яшчэ ў XIX ст. тэрыторыя "Літвы уключала ў сябе губерні: Гродзенскую, Мінскую і Віленскую, а беларускімі губернямі лічыліся Віцебская, Магілёўская і Смаленская.

Такім чынам, гісторыка-геаграфічная прывязка амаль цалкам (за выключэннем паўднёвых раёнаў сучаснай Літвы) выключае з тэрыторыі ВкЛ сучасную Літву (летапісную Жмудзь, або Самагіцію).

2) Як паказвае аналіз геральдычных дадзеных у спалучэнні з дадзенымі гістарычнай геаграфіі — толькі ваяводствы былога ВКЛ, альбо большая частка з іх, што знаходзяцца ў межах сучаснай Беларусі, маюць на сваіх гербах выяву класічнай "Пагоні".

Іншыя ваяводствы альбо іншыя адміністратыўныя адзінкі, як, напрыклад, былое, раней незалежнае ад ВКЛ Жмудскае княства (што складае зараз асноўную тэрыторыю сучаснай Літоўскай рэспублікі) карысталася сваім традыцыйным гербам: у чырвоным полі чорны мядзведзь у срэбным аброжку, які стаіць на задніх лапах. У гэтай сувязі хочацца прывесці радкі, напісаныя ураджэнцам Навагрудчыны, геніем польскай паэзіі Адамам Міцкевічам. У сваёй бессмяротнай паэме "Пан Тадэвуш" (дзея якой адбываецца ў родных яму мясцінах у пачатку XIX ст.), гаворачы вуснамі аднаго са сваіх персанажаў аб надыходзячай вайне Расіі з Напалеонам, ён пісаў:

*"Хай заржэ тут Пагоня,*
*На Жмудзі хай мядзведзь зараве".*

Думаецца, што ў сваіх творах А.Міцкевіч абапіраўся на жывую яшчэ тады геральдычную традыцыю і на гістарычную памяць сваіх сучаснікаў і землякоў.

3) Хочацца адзначыць, што за ўвесь час існавання ВКЛ, а пазней Рэчы Паспалітай, тытул вярхоўнай асобы, агульнай як для ВКЛ, так і для кароны Польскай, гучаў прыкладна гэтак: "Кароль Польскі, Вялікі князь Літоўскі, Рускі (маецца на ўвазе тэрыторыя сучаснай Львоўшчыны Рускага ваяводства. — А.Ц.) Прускі, Жамойцкі і г. д. Такім чынам, Жмудзь фігуруе ў тытуле асобна ад ВКЛ, а Беларусь увогуле не згадваецца, хаця якраз на яе тэрыторыі і знаходзілася ВКЛ. Адмаўленне ад тэрміна "Беларусь" у XVI ст. і больш позніх стагоддзях было вымушанай мерай, таму што ў гэты час назва "Белая Русь" поруч з "Малой Руссю" з'яўляецца ў тытулах маскоўскіх цароў. Дзеля таго, каб не ствараць прэцэдэнту з чыста палітычных меркаванняў абедзве Русі

інтэнсіўна замяняюцца тэрмінамі: "ВКЛ" (радзей у афіцыйных дакументах і часцей у рускім побыце — Літва) і "Украйна" (Украіна), прычым апошні нават сустракаецца ў дачыненні да тэрыторыі крайняга ўсходу Беларусі.

4) Ваяводскія вайсковыя харугвы (сцягі) ВКЛ, як правіла, нясуць на сабе герб "Пагоня", за выключэннем адно толькі Жмудзі, дзе гэты герб прадстаўлены ў дамінуючым становішчы, а жмудскі мядзведзь — у падначаленым, таму што гэтае княства было падпарадкаванае і ўключанае ў склад ВкЛ. Амаль падобная сітуацыя назіраецца і з вайсковай харугвай Падляшскага ваяводства (Падляшша — заходняя частка ВКЛ, якая была анексіравана Каронай Польскай у 1569 г.). Толькі тут "Пагоня" знаходзіцца ў падпарадкаваным становішчы, а белы польскі арол — у дамінуючым.

5) У рускім "тытулярніку" (1672 г.) ёсць выява герба "Пагоня" з надпісам "Вялікі князь літоўскі". Тым не менш тады і пазней паняцце "літоўскі" абрысоўвалася гістарычна правільна. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772 г.) і далучэння ўсходняй часткі сучаснай Беларусі да Расійскай Імперыі, гарадам гэтага рэгіёна былі падараваны новыя гарадскія гербы (1781 г.), прычым большасць з іх атрымала ў якасці элемента герб Пагоню.

Некалькімі гадамі раней з жыхароў далучаных абласцей былі створаны "нацыянальныя вайсковыя часткі": Беларуская гусарская харугва і Полацкі мушкецёрскі полк. Абодва гэтыя злучэнні атрымалі на свае штандары ў дамінуючую частку шчыта — расійскага арла, а ў другую — герб "Пагоня". Дарэчы, менавіта полацкім мушкецёрам належыць гонар узяцця лепшай у Еўропе турэцкай крэпасці — Ізмаіла.

У 1827 г. лейб-гвардыі Гродзенскі гусарскі полк атрымаў штандар з выявай двухгаловага арла, на грудзях якога шчыт "малінавага і зялёнага аксаміту" з выявай на ім літоўскага конніка".

Пазней, у 50-х гг. XIX ст., быў распрацаваны вялікі герб, дзе на крылах царскага арла размешчаны аб'яднаныя шчыты розных зямель, што ўваходзілі ў склад Расійскай Імперыі. Сярод іх — два, якія звязаны з тэрыторыяй былога ВКЛ. Шчыт аб'яднаных гербаў княстваў Беларускіх, на якім размешчаныя гербы — Полацкі, Віцебскі і Мсціслаўскі (праўда, апошні можна лічыць фантазіяй Дэпартамента герольдыі). На Полацкім і Віцебскім гербах бачны выявы традыцыйнай Пагоні, адпаведна ў срэбным і чырвоным палях.

Другі шчыт пабудаваны па таму ж прынцыпу: падзелены вілкападобна на тры часткі. У першай частцы — герб Вялікага княства Літоўскага і "на чырвоным полі

на срэбным кані, пакрытым чырвоным трохканцовым з залатою аблямоўкай дыванам, срэбны ў зброі з паднятым мячом coннік са шчытом, на якім васьміканцовы чырвоны крыж". У трэцім полі, рассечаным у верхняй частцы, срэбны аднагаловы польскі арол, а ў ніжняй — "Пагоня" ў блакітным полі. У другім жа полі герб Самагіцкі: у залатым полі срэбны на задніх лапах мядзведзь, язык чырвоны.

Па сведчаннях беларуска-літоўскіх летапісаў (напісаных на беларускай альбо пазней — на польскай мове) герб Пагоня ўваходзіць у карыстанне ў час княжання вялікіх літоўскіх князёў Нарымунта альбо Віценя ў канцы XIII ст.

У "Васкрасенскім летапісе", які не падпаў пад палітычнае рэдагаванне ў XVI — пачатку XVII ст., у адрозненне ад беларуска-літоскіх, ёсць звесткі пра тое, што пачатак "гасудароў літоўскіх" вядзецца ад князёў полацкіх. Першы віленскі князь Давід Расціслававіч (1125 г.) быў не толькі папярэднікам, але і продкам, і з'яўляўся крэўным родным і Віценю, і Нарымунту. Такім чынам, традыцыя ўжывання "Пагоні" апошнімі бярэ пачатак у Полацкім княстве.

На падставе вышэйсказанага становіцца відавочным, што герб "Літоўская пагоня" не з'яўляецца літоўскім у сучасным сэнсе гэтага слова. Гэты герб нарадзіўся з глыбока славянскіх традыцый і звязаны сваім паходжаннем непасрэдна са старажытным усходне-славянскім насельніцтвам Еўропы. Ён мае агульныя генеалагічныя карані з такімі гербамі, як кап'яносец (Георгій Пераможац) і другім — Сакольнічы.

Герб "Пагоня" выкрышталізаваўся і набыў сваю канчатковую форму на тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага — славянскай дзяржавы, дзе асноўным этнасам быў беларускі. Першай сталіцай і ядром, вакол якога пачалася кансалідацыя гэтай дзяржавы, быў Новы Гарадок (сучасны Навагрудак Гродзенскай вобласці). Асновай ваеннай моцы, культурнага і эканамічнага патэнцыялу былі таксама беларускія землі. Таму залічэнне герба "Пагоня" ў арсенал сучаснай літоўскай геральдыкі з'яўляецца поўнасцю неправамоцным — гэта наш герб.

**"Звязда",**
**1991, 31 жніўня.**
**Рускамоўны варыянт**
**быў надрукаваны:**
**"Весник Геральдиста, 1990," № 2.**

*Анатоль ГРЫЦКЕВІЧ*

# Нацыянальныя, а значыць — дзяржаўныя

1. Пры зацвярджэнні дзяржаўнага герба і дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь неабходна зыходзіць з традыцыі некалькіх стагоддзяў нацыянальнай сімволікі, якую ні адзін орган улады не можа змяніць. Пры гэтым неабходна таксама прытрымлівацца навуковага падыходу да гэтай праблемы, а не кіравацца якімі-небудзь адвольнымі інтарэсамі якой-небудзь партыі або грамадскай арганізацыі.

2. Герб "Пагоня" з'яўляецца страдаўнім гербам Вялікага княства Літоўскага і Рускага (Беларуска-Літоўскай дзяржавы), канчаткова зацверджаным у XIV стагоддзі (1384г.). Але, як сведчыць, старажытнарускі Іпацьеўскі летапіс, гэты герб быў прыняты вялікім князем літоўскім Віценем у канцы XIII стагоддзя: "А Витен нача княжиты над Литвою, измысли себе герб и всему княжеству Литовскому печать: рыцар збойный на коне з мечем, еже ныне наричут погоня" (Белоруссия в эпоху феодализма. Сборник документов и материалов. Минск, 1959. Том I. С. 70).

Аднак "Пагоня" мае яшчэ больш старажытнае, беларускае паходжанне. Так, у жыццяпісу святога Меркурыя Смаленскага (XIII ст.) ёсць звесткі аб выяве народнага героя з мячом на белым кані на дзяржаўных пячатках крывіцкіх (беларускіх) полацкага і Смаленскага княстваў у выглядзе святога Меркурыя, які бароніць крывіцкую зямлю ад ворага. Гэтая выява паходзіць з Полацкай зямлі яшчэ з дахрысціянскіх часоў і ўвасабляла тады постаць славянскага Бога сонца Ярылы. Такім чынам, герб "Пагоня" з'яўляецца старадаўнім гербам Полацкага

княства — гэтай першай дзяржавы на тэрыторыі Беларусі.

3. "Пагоня" — сімвал усеагульнага апалчэнння ўсіх мужчын для барацьбы з іншаземнымі захопнікамі, за выгнанне іх са сваёй зямлі і пагоняй за імі ў іх зямлю, каб канчаткова разбіць іх. Пад час Грунвальдскай (Дубровенскай) бітвы 1410 года, у якой былі разбіты нямецкія рыцары-крыжакі і спынена двухсотгадовая нямецкая агрэсія на зямлі Беларусі і Літвы, сярод 40 харугваў (палкоў) войска Беларуска-Літоўскай дзяржавы 30 мелі на сваіх штандарах выяву "Пагоні". Тады была ліквідавана смяротная пагроза беларускаму народу, якога чакаў лёс прусаў і Прусіі, часткова знішчаных, часткова анямечаных.

"Пагоня" — гэта гераічны сімвал барацьбы і перамогі над нямецкімі крыжакамі: коннік, павернуты на захад, імчыцца на бой з нямецкімі рыцарамі. Пасля Грунвальда многія беларускія землі і гарады таксама атрымалі гэты герб, які называўся Пагоняй, або Пагоньчыкам (у адрозненне ад дзяржаўнага герба).

4. "Пагоня" засталася дзяржаўным гербам Беларуска-Літоўскай дзяржавы (Вялікага княства Літоўскага) да канца XVIII стагоддзя, калі Кацярына II далучыла Беларусь да Расійскай імперыі. (шчыт з гербам — А.Ц.) Пасля гэтага Пагоня была ўключана ў вялікі герб Расійскай імперыі (і размяшчалася — А.Ц.) на крылах на грудзях у двухгаловага арла, побач з некаторымі іншымі далучанымі да Расійскай імперыі дзяржавамі, якія існавалі да 1917 года.

5. У 1918 годзе "Пагоня" становіцца дзяржаўным гербам Беларускай народнай рэспублікі.

6. Бел-чырвона-белы сцяг быў вайсковым сцягам беларускіх воінаў у сярэднявеччы. На першай ва Усходняй Еўропе батальнай карціне (1520 год) пра бітву пад Оршай 1514 года выразна відаць шэрагі беларускіх воінаў з белымі вымпеламі з чырвонай паскай на коп'ях. У наступных стагоддзях конныя часткі войска Вялікага княства Літоўскага і Рускага ажно да канца XVIII стагоддзя мелі гэтыя баявыя сцяжкі. Пасля далучэння Беларусі да Расійскай імперыі Кацярына II ў 80-х гадах XVIII стагоддзя сфарміравала з беларускіх ураджэнцаў Беларускі гусарскі полк і Полацкі мушкецёрскі полк. Вайсковымі адзнакамі для гэтых часцей былі какарды з бела-чырвона-белым колерамі. Як баявыя сцяжкі на піках кавалерыйскіх частак Літоўскага корпусу расейскай арміі, расквартараваных у Гродзенскай губерні, былі тыя ж вымпелы бела-чырвона-белага колеру ажно да 40-х гадоў XIX стагоддзя.

Бел-чырвона-белы сцяг як беларускі нацыянальны сцяг,

быў прыняты беларускімі рэвалюцыйнымі студэнтамі ў Пецярбургу ў канцы XIX стагоддзя. Гэты сцяг быў прыняты Усебеларускім з'ездам у Менску ў снежнім 1917 года. Народны Сакратарыят Беларускай Народнай Рэспублікі зацвердзіў яго ў жніўні 1918 года ў якасці дзяржаўнага сцяга Беларусі, зыходзячы з таго, што гэта нацыянальны беларускі сцяг.

7. З навуковага гістарычнага пункту гледжання герб "Пагоня" і бел-чырвона-белы беларускі нацыянальны сцяг з'яўляюцца адзіна вернымі нацыянальнымі і, такім чынам, дзяржаўнымі сімваламі незалежнай Рэспублікі Беларусь.

**Народная газета,**
**2 кастрычніка 1991 г.**

## ...Калі ёсць такая магчымасць

Пасля прыняцца 19 верасня 1991 г. Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь закону аб Дзяржаўным гербе і Дзяржаўным сцягу Рэспублікі Беларусь у Сакратарыят Вярхоўнага Савета, рэдакцыю "Народнай газеты" звяртаецца шмат прадстаўнікоў арганізацый і ўстаноў, грамадзян з просьбай растлумачыць парадак выкарыстання дзяржаўных сімвалаў і магчымасць самім пашыць бела-чырвона-белы сцяг. Адказаць на некаторыя пытанні чытачоў мы папрасілі народнага дэпутата В.Голубева, намесніка старшыні Камісіі па выпрацоўцы эталона Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь.

Неабходна адзначыць, што парадак выкарыстання дзяржаўных сімвалаў павінен вызначаць Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь. Зараз працуе Камісія па выпраўцоўцы эталона Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь і палажэння аб гербе, пячатках Вярхоўнага Савета і яго Прэзідыўма. Камісія складаецца з народных дэпутатаў, навукоўцаў, мастакоў, прадстаўнкоў грамадскасці.

Дзяржаўны герб Рэспублікі Беларусь — старажытны беларускі герб "Пагоня" уяўляе сабой выяву размешчанага на чырвоным шчыце конніка з мячом, які скіравны ў левы бок, з шчытом, на якім знаходзіцца шасціканцовы крыж. Канчатковы эталон герба, яго асобныя дэталі дапрацоўваюцца камісіяй. Пасля прыняцца адпаведнага рашэння Вярхоўным Саветам у прэсе будзе надрукавана выява герба і парадак яго выкарыстання.

Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь — палотнішча, якое складаецца з трох гарызантальна размешчаных палос роўнай шырыні: верхняй і ніжняй белага, а сярэдняй — чырвонага (кармін) колеру. Адносіны шырыні сцяга да яго даўжыні — 1:2. Гэта значыць, што даўжыня сцяга павінна быць у два разы большай, чым сума шырыні ўсіх трох палос. Напрыклад, шырыня 10 см, даўжыня 20

см; шырыня 1 м, даўжыня 2 м; шырыня 1,5 м, даўжыня 3 м і г.д. Улічваючы гэтыя нормы, кожны грамадзянін рэспублікі можа сам пашыць такі сцяг. Палажэнне аб дзяржаўным сцягу Рэспублікі Беларусь таксама рыхтуе камісія, і яно будзе вынесена на разгляд сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.

Інфармуем паважаных чытачоў, што Камісія Вярхоўнага Савета па адукацыі, культуры і захаванню гістарычнай спадчыны звярнулася да Старшыні Савета Міністраў рэспублікі, на якіх будзе вырабляцца дзяржаўны сцяг і арганізаваць вытворчасць. Так што ў хуткім часе не толькі афіцыйныя ўстановы, але і кожная беларуская сям'я зможа мець у хаце галоўны дзяржаўны сімвал рэспублікі, як то ёсць ва ўсіх цывілізаваных краінах.

**Валянцін ГОЛУБЕЎ,**
**намеснік старшыні Камісіі**
**па выпрацоўцы эталона**
**Дзяржаўнага герба**
**Рэспублікі Беларусь,**
**народны дэпутат БССР.**

**"Народная газета"**
**2 кастычніка 1991 г.**

# Гісторыю у народа не адабраць

***(З пастановы Вучонага савета Інстытута гісторыі АН БССР, якое адбылося 12 верасня 1991 года)***

*Заходзячы з таго:*

*— што герб "Пагоня" мае шматвяковую гісторыю і адлюстроўвае сумесную гераічную барацьбу беларускага і літоўскага народаў за сваю незалежнасць;*

*— што ён у канцы XIV стагоддзя стаў сімвалам іх дзяржаўнага саюза ў форме Вялікага княства Літоўскага;*

*— што ў слаўнай бітве пад Грунвальдам у 1410 годзе, якая паклала канец нямецкай агрэсіі на ўсход, беларускія палкі выступалі з "Пагоняй" на баявых сцягах;*

*— што ў XV — XVI стагоддзях выява "Пагоні" была на харугвах Берасцейскага, Віцебскага, Полацкага, Мсціслаўскага, Менскага, Віленскага, Навагародскага ваяводстваў і шэрагу паветаў Беларусі;*

*— што ў гербе "Пагоня" адлюстраваны нацыянальныя колеры беларускага народа — белы і чырвоны;*

*— што герб "Пагоня" і геральдычна звязаны з ім бел-чырвона-белы сцяг былі ў 1918 годзе зацверджаны Сакратарыятам Беларускай Народнай рэспублікі ў якасці дзяржаўных сімвалаў Беларусі;*

*— што герб і сцяг БССР, зацверджаныя ў 1951 годзе, не адлюстроўваюць шматвяковую гераічную гісторыю і нацыянальныя колеры беларускага народа і сталі сімвалам адміністрацыйнага рэжыму;*

*— што пад сімваламі "Пагоня" і бел-чырвона-белым сцягам развіваўся і развіваецца беларускі адраджэнцкі рух.*

*Вучоны савет Інстытута гісторыі Акадэміі навук Беларусі прапануе:*

*1. Зацвердзіць у якасці дзяржаўных сімвалаў Рэспублікі Беларусь герб з выявай "Пагоні" і бел-чырвона-белы сцяг.*

*2. Лічыць мэтазгодным надаць суверэннай Беларускай дзяржаве назву "Рэспубліка Беларусь".*

*3. Вырашэнне пытання аб дзяражуным гімне Рэспублікі Беларусь даручыць кампетэнтнай камісіі.*

*4. Сталіцы Рэспублікі Беларусь вярнуць старажытную гістарычную назву — горад Менск.*

**Міхась КАСЦЮК,**
**старшыня Вучонага савета:**
**Міхась КОШАЛЕУ,**
**вучоны сакратар савета.**
**Народная газета, 2 кастрычніка 1991 г.**

*Георгі ШТЫХАЎ,*

*Георгі ГАЛЕНЧАНКА*

# Сімволіка старажытнага герба

Герб з'яўляецца сімвалам выражэння гістарычных традыцый свайго ўладальніка — дзяржавы, горада, асобы і г.д. Беларусам давялося больш за 500 год жыць у адной дзяржаве з літоўцамі і іншымі народамі, разам змагацца з чужынцамі час зацятых войн, падзяляць радасць перамог і перажываць няшчасці. Наша гісторыя была гераічнай і трагічнай. Яе не пераробіш і не перапішаш. Вось чаму мы "асуджаны" сваім мінулым на тое, каб мець Пагоню нацыянальным і дзяржаўным гербам.

Між тым некаторыя аўтары сцвярджаюць, што Пагоня не мае непасрэднага дачынення да гісторыі Беларусі, не выходзіць з беларускіх традыцый (круглы стол пра сімволіку Беларусі, "Звязда", 7 чэрвеня 1089 г.). Яны зыходзяць з таго, што заснавальнікам Пагоні абавязкова быў літоўскі князь Нарымунт, які спачатку перанёс сталіцу княства ў г.Кернаў на тэрыторыю этнічнай Літвы з Новагародка (Навагрудка), а потым стварыў герб Пагоня.

У гісторыі беларуска-літоўскай дзяржаўна-геральдычнай традыцыі (як і ў большасці іншых еўрапейскіх краін у сярэднія вякі) дакладна праслежваюцца легендарныя і міфалагічныя звесткі побач з пазнейшымі строга дакументальнымі пацвярджэннямі. Выклікае немалае здзіўленне, што не толькі некаторыя сучасныя папулярызатары, але і дыпламаваныя гісторыкі з поўным даверам спасылаюцца на летапісныя і хранікальныя сведчанні без усялякіх спроб гістарычнай і крыніцазнаўчай крытыкі.

Адзначым, па-першае, што існуе некалькі летапісных

версій наконт гістарычнага паходжання герба Пагоня. Адна з іх прыводзіцца ў Густынскім летапісу першай паловы XVII стагоддзя, дзе сказана, што князь Віцень (атрымаў сталец у канцы XIII ст.) "измысли себе герб і всему князьству печать: рыцар збройный на коне с мечом, еже ныне наричут погоня".

Некаторыя летапісы і хронікі другой паловы XVI ст. сапраўды звязваюць узнікненне герба Пагоня з дзейнасцю другога вялікага князя літоўскага Нарымунта. Часам спасылаюцца на "Хроніку Літоўскую і Жамойцкую", але падобныя звесткі маюцца і ў хроніцы Быхаўца, хроніцы Стрыкоўскага (упершыню выдадзена ў 1584 г.) і ў некаторых іншых помніках. Блізкі або амаль ідэнтычны тэкст даказвае, што шэраг фрагментаў проста перапісваўся летапісцамі з больш ранніх помнікаў, а не апіраўся на новыя крыніцы ці нейкую новую летапісную традыцыю. Трэба асабліва адзначыць, што ўзнікненне вышэйадзначанай геральдычнай версіі праследжваецца ў даволі позніх летапісных помніках выразна антыпольскай арыентацыі, калі ўзнікла ідэалагічная патрэба абгрунтаваць даўнюю гістарычную незалежнасць Вялікага княства Літоўскага, у тым ліку паходжання яе дзяржаўнага гербу. Не выпадкова ў беларускіх больш ранніх летапісных зводах XV — першай паловы XVI стст. няма ніякіх падобных звестак.

Літаральнае ўспрыняцце летапісных тэкстаў можа прывесці даследчыкаў да нечаканых вывадаў. Вядома, напрыклад, што ў некаторых польскіх, літоўскіх і беларускіх летапісах знайшла адлюстраванне зусім неверагодная версія: паходжанне літоўцаў звязваецца з часамі Рымскай імперыі і перасяленнем часткі рымскіх нобілей на чале з князем Палемонам на тэрыторыю Літвы. Такім чынам, ніякім сфрагістычным і іншым дакументальным матэрыялам летапісныя версіі аб гербе Віценя і Нарымунта пакуль што не пацвярджаюцца.

Безумоўна, герб Пагоня ўваходзіць у асаблівую групу так званых конных гербаў, досыць распаўсюджаных у еўрапейскай, а часткова і ва ўсходнеславянскай (полацкай, ноўгарадскай), мазавецкай геральдыцы. Фігура коннага рыцара звычайна васабляла постаць князя, вярхоную ўладу. Як родавы герб Пагоня выкарыстоўвалася некаторымі князямі Вялікага княства Літоскага ў другой палове XIV ст. і пазней.

З'яўляецца несумненным факт, што класічны варыянт герба Пагоня (з выявамі ўзбройнага рыцара на коні белым "у полю чырвоным" з шчытом, упрыгожаным шасціканцовым крыжам) замацаваўся ў дзяржаўнай геральдыцы Вялікага княства Літоўскага ў сярэдзіне 80-х гадоў XIV ст. у непасрэднай сувязі з Крэўскай уніяй (1385 г.). Герб Пагоня, які быў гербам вялікіх князёў

літоўскіх, адначасова з'яўляўся гербам усяго Вялікага княства Літоўскага, бо ў сярэднія вякі дзяржаўнасць і незалежнасць перш за ўсё ўвасабляліся ў асобе вялікага князя, яго вярхоўнай уладзе.

Неабходна падкрэсліць, што Вялікае княства існавала на тэрыторыі этнаграфічнай Літвы, Беларусі (у XIII — XVIII стст.) невялікай часткі Расіі (да 30-х гадоў XVI ст.), ахоплівала большасць украінскіх зямель.

Каб зразумець пачатковы сэнс сімволікі Пагоня прыгадаем зноў гісторыю. Віцень княжыў з 1293 да 1316 года і знаходзіўся ў Навагрудку. Ён умацаваў дзяржаву, абапіраючыся на Навагародскае, Гродзенскае, Полацкае княствы. У 1294 годзе змагаўся супраць жэмайцкіх феадалаў, якія схіляліся да саюзу з нямецкімі рыцарамі. Пры гэтым князе літоўскае і беларускае войска адбіла напады крыжакоў на Жэмайцію і беларускія землі. Берагі Нёмана сталі месцамі зацятых бітваў войска Вялікага княства Літоўскага з Тэўтонскім ордэнам, калі ён асталяваўся паміж вусцямі рэк Віслы і Нёмана.

У бітвах з нямецкімі рыцарамі, якія ўварваліся на Панямонне, асабліва вызначаліся беларускія атрады на чале з Давыдам Гарадзенскім.

Працытуем, што аб гэтым напісана ў "Гісторыі Літоўскай ССР" (1978 г.): "У 1284 г. крыжаносцы пад кіраўніцтвам магістра Конрада Шырберга напалі на Гродна і абрабавалі горад. У 1295 — 1296 гг. яны зноў спустошылі Гродзенскую зямлю. Ваенныя набегі сталі больш частымі, рыцары даходзілі да Новагародка. У 1314 г. яны аблажылі замак і горад, але былі разбіты аб'яднаным войскам гараджан і літоўцаў. Узначаліў гэтае войска гродзенскі стараста Давыд. У 1323 г. пад яго кіраўніцтвам аб'яднаныя дружыны аказалі дапамогу Пскову і на рацэ Нарве нанеслі параджэнне нямецкім і дацкім рыцарам". Вось — яно братэрства па зброі паміж літоўцамі, беларусамі, рускімі ў сумеснай барацьбе супраць "націска на ўсход". Сягае баявое братэрства ў старажытныя часы. Гэту памяць нам трэба берагчы і ёй ганарыцца.

Барацьба з нямецкай феадальнай агрэсіяй была першачарговай справай Вялікага княства Літоўскага ў XIV — XV стст., калі тэўтоны ўзмацнілі свае грабежніцкія паходы.

На рубяжы XIII — XIV стст. за няпоўную чвэрць стагоддзя Вялікаму княству прыйшлося адбіваць звыш 30 нападаў тэўтонаў і прымаць удзел яшчэ ў 14 паходах супраць іх.

Толькі за кароткі перыяд з 1345 па 1392 гады крыжакі зрабілі 96 нападаў на Літву і Беларусь. Адбылася буйная бітва на рацэ Стрэве ў 1348 годзе крыжаносцы былі

вымушаны пакінуць межы Літвы. Шмат разоў яны рабілі безпаспяховыя спробы захапіць Полацк.

У святле такіх фактаў становіцца зразумелай сімволіка Пагоні і яе папулярнасць у сярэднявяковай літоўска-беларускай дзяржаве.

У дакуменце 1387 года растлумачваецца, што паводле народнага разумення, Пагоня — гэта праследванне ворагаў, каб яны ўцякалі з нашай зямлі. "Згодна са старадаўнімі звычаямі, — адзначана ў вялікакняскім прывілеі ад 20 лютага 1387 г., — ваенны паход з'яўляецца абавязкам, які выконваецца за кошт уласных магчымасцяў, сродкаў. У тым выпадку, калі ўзнікае неабходнасць праследаваць ворагаў, непрыяцелеў нашых, якія б пусціліся на ўцёкі з нашай літоўскай зямлі! (маецца на ўвазе ўсё Вялікае княства Літоўскае). У праследаванні ворагаў, якое па народнаму завецца пагонец, павінны ўдзелінічаць не толькі рыцары, але і кожны мужчына, які мае магчымасць насіць зброю, якога б не быў ён паходжання і стану".

У барацьбе з крыжаносцамі павінна было ўдзельнічаць усё мужчынскае насельніцтва, здольнае насіць зброю, а не толькі ваенныя. У другой крыніцы — "Хроніцы Літоўскай і Жамойцкай" пацвярджаецца "в гербе муж збройный, на коне белом, в полю червоном, меч голый, яко бы кого гоначи держал над головою, и есть оттоля названный Погоня".

Беларускія атрады разам з польскімі, літоўскімі, рускімі, украінскімі і іншымі мужна змагаліся ў Грунвальдскай бітве ў 1410 г. Па няпоўных дадзеных пісьмовых крыніц з беларускіх земляў тут былі атрады з Полацка, Віцебска, Гродна, Бярэсця (Брэста), Пінска, Навагародку, Ліды, Ваўкавыску, Мсціслаўя. На самой жа справе беларускіх атрадаў было больш. Менавіта ім належала большасць харугваў з выявай Пагоні.

Паводле сусветнай хронікі М.Бельскага, герб Пагоня ў другой палове XVI ст. упрыгожваў харугвы ўсіх 9 ваяводстваў Вялікага княства Літоўскага, акрамя Смаленскага, якія ў той час ахоплівалі беларускія і літоўскія землі. Некаторыя харугвы з гербам Пагоня адрозніваліся памерамі, сваёй формай (аднарогія — аднаканцовыя, двухрогія і інш.), колерам, некалі дадатковымі выявамі. Харугвы Віленскага і Навагародскага ваяводстваў мелі на другім баку сваіх сулгаў адпаведна выяву з "калумнамі" (калонамі або так зв. слухалі Гедымінавічаў) і чорнага анёла. Звычайна герб Вялікага княства Літоўскага зняшчаўся ў чырвоным полі (ваяводствы Троцкае, Навагародскае, Берасцейскае, Віцебскае, Мсціслаўскае), а ў сцягах Полацкага і Менскага ваяводстваў — у белым полі. У каляровай гаме саміх харугваў таксама пераважвалі чыр-

воныя і цёплыя фарбы, харугвы Полацкага і Менскага ваяводстваў былі ізялістага колеру, Віцебскага — зялёнага, Мсціслаўскага — жоўтага. Згодна з апісаннем другога гісторыка Аляксандра Гваніні, які, дарэчы, служыў ротмістрам у войску Вялікага княства Літоўскага і ўдзельнічаў у Лівонскай вайне і быў камендантам Віцебскага замку, ваяводскія харугвы былі двухрогавыя, павятовыя аднарогавыя. Паводле Гваніні, чырвоныя фарбы і герб Пагоня вылучалі земскія харугвы Ашмянскага павета, Вількомірскага (на другім баку выява св. архангела Міхаіла), Браслаўскага, Рэчацкага, Слонімскага, Валынскай зямлі, Полацкага, Менскага, Навагрудскага ваяводстваў.

Харугва Мсціслаўскага ваявадства была "памераньчавай" масці, Берасцейскага — лазуравай, Кіеўскага! і Віцебскага — зялёнай. Двухрогавыя харугвы Віленскага і Трокскага ваяводстваў (35 локцяў кітайкі) таксама ўпрыгожваліся гербам Пагоня на белым або на чырвоным фоне. Праўда, харугва Віленскага ваяводства мела на другім баку гербавую эмблему Калумны.

Звяртае ўвагу тая акалічнасць, што герб Пагоня ў часы існавання Вялікага княства Літоўскага ў адрозненні ад воінскіх ваяводскіх і павятовых харугваў не знайшоў шырокага ўжывання ў гарадской геральдыцы Беларусі. Тлумачыць гэта трэба тым, што мяшчанскае гарадское саслоўе павінна было адрозніваццца сваёй геральдыкай ад рыцарскай сімволікі. Рыцарскія гербы былі выключнай прывілегіяй шляхецкага стану, азначалі пэўныя ваенныя абавязкі і адначасова давалі шырокія палітычныя, сацыяльна-эканамічныя прывілегіі. Правы мяшчан былі намнога больш вузкія, у чым лёгка ўпэўніцца, калі нават бегла пазнаёміцца са Статутам Вялікага княства.

Дынастычная ўнія Польшчы і Вялікага княства Літоўскага (1385) абумовіла пэўныя змены ў дзяржаўнай сімволіцы. З канца XIV ст., а тым больш пасля Люблінскай уніі 1569 г. і стварэння Рэчы Паспалітай Арол і Пагоня змяшчаюцца побач на адным гербавым шчыце ці на адной дзяржаўнай пячатцы, падкрэсліваючы асабліва блізкія палітычныя сувязі паміж абедзвюма дзяржавамі. Падобны двайны герб можна ўбачыць на кнігах, якія выдаваліся ў часы Скарыны ў кракаўскіх друкарнях, яны ўпрыгожвалі харугвы на пышных дзяржаўных пахаваннях Жыгімонта I (1548) або Жыгімонта Аўгуста (1573), выкарыстоўваліся пазней у нацыянальна-вызваленчых рухах, у якіх удзельнічала (акрамя Польшчы) насельніцтва беларускіх і літоўскіх зямель. Сейм 1831 г. прыняў спецыяльную пастанову, згодна з якой народныя какарды павінны былі захоўваць фарбы гербаў Польскага каралеўства і Вялікага княства Літоўскага, г. зн. белую і

чырвоную, што адпавядала і геральдычным традыцыям.

Як сімвал дзяржаўнай незалежнасці адасоблены герб Пагоня выкарыстоўваецца ва ўсіх найбольш значных вялікакняскіх публічна-прававых актах — агульназемскіх, зямельных, у прыватнаўласніцкіх прывілеях, замацоўвае міжнародныя дагаворы. Не выпадкова герб Пагоня значыцца таксама на тытульных лістах першага друкаванага выдання славутага Статута Вялікага княства Літоўскага 1588 г. Згодна з пастановай 1579 г. дзяржаўная пячатка павінна была захоўвацца пры канцлеры і падканцлеры Вялікага княства Літоўскага. Польшча карысталася сваёй "каронная" пячаткай. Прывілеі, якія датычыліся нова далучанай Інфляндыі (зямель былога Лівонскага ордэна), у канцы XVI — пачатку XVII ст.ст. зацвярджаліся абедзвюма пячаткамі.

Статуты Вялікага княства Літоўскага 1566 і 1588 гадоў прадугледжвалі таксама абавязковае выкарыстанне дзяржаўнай (гаспадарскай) пячаткі з выявай Пагоні ў мясцовых канцылярыях і судзебных установах "Теж мы господар даем под гергьбом того Паньства нашого Великого князства Литовъского Погонею печать до кожъжого повету, на которой ест написано около гербу имя того повету. А тую печать писар земъский присяжный у себе сам, а не хто инзшый, ховати маеть, которую печатью и под титулом нашим позвы (судовыя павесткі) мают быта печатованы и выдаваны". (Статут Вялікага княства Літоўскага, 1566 г. Раздзел 4, артыкул 12).

Выява Пагоні сустракаецца зрэдку ў гарадской геральдыцы Беларусі, шырока выкарыстоўваецца ў мастацтве, жывапісу, скульптуры. Гербам Пагоня карыстаюцца знатныя арыстакратычныя роды — князі Слуцкія, Сангушкі, Чартарыйскія і інш.

Вельмі істотнай часткай герба з'яўляецца шасціканцовы крыж, які адлюстроўваўся жоўтым (залатым) на сінім шчыце. Яго паходжанне канчаткова не высветлена. Не выключана, што ён звязаны з традыцыямі візантыйскай культуры і праваслаўнай царквы. У гэтай сувязі звяртае ўвагу, што шасціканцовым з'яўляецца крыж Ефрасінні Полацкай, зроблены ў 1161 годзе.

Згодна з меркаваннямі іншых даследчыкаў, шасціканцовы крыж быў радавым гербавым знакам вялікага князя літоўскага (а пазней яшчэ і польскага караля) Ягайлы і потым замацаваўся ў дзяржаўнай геральдыцы "Вялікага княства Літоўскага, Рускага, Жамойцкага і іншых зямель".

Герб Пагоня быў сімвалам дзяржаўнасці Вялікага княства Літоўскага да канца XVIII стагоддзя. У 1795 г. пасля падзелаў Рэчы Паспалітай царскі ўрад скасаваў герб Пагоню як дзяржаўны герб ліквідаванага княства.

У 1918 г. герб Пагоня быў прыняты ў якасці дзяржаўнага Сакратарыятам Беларускай Народнай Рэспублікі. Пагоня была гербам Літоўскай Рэспублікі з 1919 да 1940 г. які зараз зноў адроджаны ў Літве.

У адпаведнасці са свай гістарычнай спадчынай беларускі народ, як і літоўскі, маюць аднолькавае права карыстацца гербам Пагоня пры ўмове, што гербы будуць мець пэўныя геральдычныя адрозненні.

Гісторыя герба Пагоня — наша спадчына, якой мы павінны ганарыцца і разумець так, як пісаў М.Багдановіч у аднайменным сваім творы, што "яе нікому і ніколі не разбіць, не спыніць, не стрымаць".

Пагоня з'яўляецца зараз гербам Літоўскай Рэспублікі. Аднак гэта ніколі не замінае, каб Пагоня была гербам таксама Рэспублікі Беларусь. Паўторы асноўных элементаў герба шырока распаўсюджаны ў сусветнай геральдыцы. Так, аснову герба шасці еўрапейскіх дзяржаў (Польшчы, Германіі, Албаніі і інш.) складае выява арла, дзесяці дзяржаў (Бельгія, Балгарыя і г.д.) — выява льва. Дакладнае капіраванне гербаў у геральдыцы не дапускаецца — выявы павінны адрозніваецца ў нейкіх, можа нязначных элементах.

Галоўны сцяг Вялікага княства Літоўскага ў XVI — XVIII стст. — гэта чатырохрогавая харугва памераў 60 локцеў чырвонай кітайкі, у сярэдзіне герб Пагоня — узброены рыцар на кані белым, зверху княжацкая карона. На другім баку сцяга — тры слупы ў полі чырвоным, або выява Багародзіцы Марыі з дзіцём Хрыстом. Харугву найвышэйшага гетмана Вялікага княства Літоўскага таксама ўпрыгожваў герб Пагоня ў чырвоным полі.

Для нашага народу асабліва важна, што практычна ўвесь свядомы беларускі адраджэнцкі нацыянальна-вызваленчы рух развіваўся і развіваецца пад знакам Пагоні і бел-чырвона-белым сцягам.

Традыцыйнымі вельмі пашыранымі колерамі ў народным мастацтве і геральдыцы, вайсковых харугвах (сцягах) на Беларусі лічацца белы і чырвоны. Відаць, гэта паўплывала, калі ў колах беларускага нацыянальна-вызваленчага руху падымалася пытанне аб стварэнні нацыянальнага сцяга. Праект трохпалоснага бел-чырвона-белага сцяга быў складзены па законах гістарычнай геральдыкі, якая ўлічвала традыцыі Вялікага княства Літоўскага.

Гістарычны герб Вялікага княства Літоўскага са знакам Пагоні і нацыянальны бел-чырвона-белы сцяг нехта імкнуўся ачарніць, называючы іх фашысцкай атрыбутыкай. Для адукаванага разважлівага чалавека, які ведае гісторыю, гэта гучыць як глупства і з'яўляецца такім жа абсурдам, якім была б забарона размаўляць на роднай мове, бо на ёй размаўлялі ў час вайны нацыяналісты,

ці не хадзіць у царкву, бо яе тады наведвалі калабаранты.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі Беларусь, як і іншыя рэспублікі атрымала ўніфікаваны герб і сцяг, якія не адпавядалі шматвекавой багацейшай гістарычнай спадчыне народа. Таму зараз у новых умовах Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь прыняў абгрунтаваную пастанову ўзяць за аснову дзяржаўнага герба Пагоню і адпаведна з гэтым бел-чырвона-белы сцяг у якасці дзяржаўнага.

**"Навіны беларускай акадэміі",**
**1991г., 11 кастрычніка.**

# Змест


***Санько В.*** Сімвал і мова — брат і сястра . . . 3
***Цітоў А.*** Лёс сімвала — лёс народа . . . . . 7
***Грыб Т.*** Да пытання аб паходжанні гербу “Пагоня” . . . . . . . . . . . . . . . . 11
***Цітоў А.*** Дык хто ж ён, “збройны рыцар на кані”? . . . . . . . . . . . . . . . 21
***Штыхаў Г.*** Што ведаць, чым ганарыцца . . . . 24
***Цітоў А.*** У цені двухгаловага арла . . . . . . 33
***Казбярук У.*** Аб сімвалах і колерах . . . . . . 37
***Кошалеў В.*** Колеры “Пагоні” . . . . . . . . . 39
***Тюрин П., Тюрин М.*** “Nach Wendischen Siten” . 42
***Ткачев М.*** Национальные символы: народ и история . . . . . . . . . . . . . . . . . 48
***Каменцева Е.*** История и символика герба Москвы . . . . . . . . . . . . . . . . . 65
***Будзько С.*** Не разбіць, не спыніць, не стрымаць . . . . . . . . . . . . . . . . . 83
***Зайкоўскі Э.*** Сакральныя вытокі герба Пагоня . 85
***Вячорка В.*** “Кроў лягла чырвонай паласой...” . . 93
***Цітоў А.*** Якім быць гербу незалежнай Беларусі? . . . . . . . . . . . . 106
***Грыцкевіч А.*** Нацыянальныя, а значыць, дзяржаўныя . . . . . . . . . . . . . . . . . 111
***Голубеў В.*** ...Калі ёсць такая магчымасць . . . 113
Гісторыю ў народа не адабраць (з пастановы Вучонага савета Інстытута гісторыі АН БССР, якое адбылося 12 верасня 1991 года) . . . . . . 115
***Штыхаў Г., Галенчанка Г.*** Сімволіка старажытнага герба . . . . . . . . . . . . . 116

Адказны за выпуск ***В. А. Санько***
Рэдактары ***І. Л. Васілец, В. А. Санько***
Мастак ***А. І. Цыркуноў***
Мастацкі рэдактар ***А. І. Цыркуноў***
Карэктар ***Р. С. Ахрэмчык***

Здадзена ў набор 20 сакавіка 1995. Падпісана да друку 6 красавіка 1995. Фармат 60x90 1/16. Ул.-выд. арк. 9,45 Друк. арк. 8,0 Ліцэнзія ЛВ № 119. Тыраж 2000 экз. Заказ

Беларускае выдавецкае Таварыства "Хата", 220029, Мінск, пр. Ф. Скарыны, 31. Заснавальнік — Беларускі дзіцячы фонд.
Друкарня ЭКП "Светач".
220141, Мінск, Жодзінская, 24а.

# Открытое акционерное общество "Минский лакокрасочный завод"

## Старейшее химическое предприятие республики — новая технология

**Высококачественные эмали для наружных и внутренних работ, для окраски деревянных и металлических поверхностей, в т.ч. автотракторной техники**

***ОСОБЫЕ ДОСТОИНСТВА:*** *низкий расход эмали, возможность сушки от 20°С до 120°С, при этом время высыхания уменьшается пропорционально увеличению температурного режима.*

*Составы для декоративно-защитной отделки древесины облагораживают интерьер, украшают ваш быт и создают настроение.*

***ВСЕ ЦВЕТА, НИЗКИЕ ЦЕНЫ.***

***ОТГРУЗКА ЛЮБЫМ ВИДОМ ТРАНСПОРТА.***

***ДЛЯ РОЗНИЧНЫХ ПОКУПАТЕЛЕЙ — ФИРМЕННЫЙ МАГАЗИН С КОМПЛЕКСОМ УСЛУГ.***

**Наш адрес: 220073, г.Минск, ул.Бирюзова, 4.**
**Проезд: автобусом NN 40, 46, 72, 78, 97, 105 до ост. "ул. Бирюзова"**
**троллейбусом NN 4, 6, 13, 22, 23, 32, 44 и автобусом N 114 до остановки "ул. Гусовского"**

**Директор — 54-00-83**
**Главный инженер — 54-09-92**
**Зам. директора по коммерческим вопросам — 54-79-01**
**Отдел маркетинга и сбыта — 54-01-66, 54-03-66**
**факс (0172) 54-73-25**
**телетайп 252793 "EMAL BY"**

**ПИШИТЕ ЗВОНИТЕ ПРИХОДИТЕ**

# ВСЕГДА ВАМ РАДЫ




## ГІСТОРЫКА-ГЕРАЛЬДЫЧНАЯ КАРТА БЕЛАРУСІ (ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА) ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XVI СТ.

Ваяводствы Вялікага княтва Літоўскага, тэрыторыя якіх галоўным чынам супадае з межамі сучаснай Беларусі, мелі на сваіх гербах выяву Пагоні. Толькі яны. Другія адміністрацыйныя адзінкі, ўключаныя ў Вялікае княства Літоўскае пазней (Чарнігаўскае і Смаленскае ваяводствы), а таксама Жмудзь— Самагіція, тэрыторыя якой амаль цалкам супадае з Летувай, мелі свае ўласныя гербы.

Герб Жмудзі — мядзведзь — прысутнічае ў тагачасных гербоўніках. Акрамя таго, у тытулатуры караля — вялікага князя пры пераліку належных яму земляў, Жмудзь як тэрытарыяльная адзінка пастаянна называецца асобна. Напрыклад: "Кароль Польскі Вялікі Князь Літоўскі, Рускі, Прускі, Жамойцкі..." і г.д. Асобнае абазначэнне Жамойсці або Жмудзі ў тытуле па законах геральдыкі патрабавала асобага герба. І ён быў — "мядзведзь чорны з белым ашыйнікам у чырвоным полі".

Прапанаваная карта вельмі наглядна і пераканаўча ілюструе сітуацыю ў зямельнай геральдыцы, што існавала ў былым ВкЛ ў другой палове XVI ст. Ды і ў наступныя часы.

Як бачым, землі вакол Беларусі не маюць Пагоні на гербах. Толькі на грудзях двухгаловага арла мы бачым у нечым падобны да Пагоні старажытны маскоўскі герб — вершнік на кані, які забівае дзідай цмока. Апошні сюжэт, дарэчы, у старажытнай геральдыцы мае назву "Пагоня IV".

*Аўтар карты А. Цітоў. Спадчына, 1989, N 2.*